НА ФЕРМЕ БОТЫ НЕ ПАТРЭБНЫЯ 3

ЯЗВУ ВЫЛЕЧЫЦЬ ЛЯГЧЭЙ... 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

17 САКАВІКА 2021 г. СЕРАДА

№ 49 (29418)

ЗВЯЗДА

Прэзідэнт падпісаў указ аб Канстытуцыйнай камісіі

Указ № 105 прыняты для рэалізацыі палажэнняў рэзалюцыі VI Усебеларускага народнага сходу, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Створанай Канстытуцыйнай камісіі даручана распрацаваць прапановы па змяненні Канстытуцыі Беларусі і забяспечыць іх ўсенароднае абмеркаванне. Яна надзелена правам пры неабходнасці задзейнічаць у рабоце кіраўнікоў і спецыялістаў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

Да 1 жніўня 2021 года Канстытуцыйная камісія павінна прадставіць Прэзідэнту Беларусі выпрацаваныя прапановы па змяненні Асноўнага Закона краіны для наступнага іх вынясення на рэспубліканскі рэферэндум.

У склад Канстытуцыйнай камісіі ўвайшлі 36 чалавек. Гэта прадстаўнікі дзяржаўных органаў, юрыдычнай навукі, грамадскіх аб'яднанняў, розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы — заслужаныя і аўтарытэтныя людзі, якія маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю. Кіраваць работай камісіі будзе старшыня Канстытуцыйнага суда — заслужаны юрыст Беларусі Пётр Міклашэвіч. Яго намеснікі на пасадзе старшыні камісіі — старшыні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка і Наталля Качанава.

У склад Канстытуцыйнай камісіі таксама ўвайшлі парламентарыі: сенатары Алег Румо, Таццяна Рунец, Сяргей Сівец і дэпутаты Святлана Любецкая, Ігар Марзалюк, Валянцін Семяняка.

Выпрацоўваць прапановы па змяненні Асноўнага Закона ў складзе камісіі будуць і прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання. У іх ліку старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Бугроў, Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў Алег Буевіч, Калінкавіцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Замосцік, Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай Кудравец і Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая.

СТАР. 2

ПВТ як рухавік прагрэсу

У Палацы Незалежнасці абмеркавалі ўдасканаленне заканадаўства з мэтай прыцягнення сусветнага капіталу ў беларускую ІТ-сферу

У канцы мінулага тыдня ў эфіры «Беларусь 1» кіраўнік Парка высокіх тэхналогій Усевалад Янчэўскі расказаў пра рэкордныя дасягненні ўстановы летась. Паводле яго слоў, мінулы год для ПВТ аказаўся самым паспяховым за ўсю гісторыю. Экспарт рэкордны — 2,7 мільярда долараў, агульны аб'ём вытворчасці — 7,4 мільярда долараў. Усевалад Янчэўскі адзначыў, што галоўны вынік работы ПВТ нават не рост аб'ёмаў вытворчасці і экспарту, а павелічэнне колькасці новых рэзідэнтаў.

Ужо праз некалькі дзён размовы пра ІТ-галіну перанесліся з тэлебачання ў Палац Незалежнасці. На нарадзе Прэзідэнт са старшынёй КДК Васілём Герасімавым, старшынёй Праўлення Нацбанка Паўлам Калаурам, першым намеснікам прэм'ер-міністра Мікалаем Снапковым, намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыем Крутым, начальнікам Аператыўна-аналітычнага цэнтра Андрэем Паўлючэнкам, першым намеснікам старшыні КДБ Сяргеем Церабавым абмяркоўвалі праекты прававых актаў, накіраваных на спынненне незаконных фінансавых аперацый у сферы высокіх тэхналогій.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што яшчэ нейкія два дзясяткі гадоў таму фінансы і ІТ-індустрыя жылі кожны сваім жыццём, але сёння сусветныя тэндэнцыі такія, што «лічба» ў літаральным сэнсе пранікае ў кожны дом. Па яго словах, дзеянні, а часам і проста публічныя заявы кіраўніцтва лічбавых гігантаў, сталі істотна ўплываць на традыцыйныя галіны — аўтамабілебудаванне, транспарт, лагістыку, паслугі, касмічныя распрацоўкі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў некаторых краінах інструменты ІТ-карпарацый актыўна і непрыкрыта выкарыстоўваюцца ў палітычных працэсах — тых, што выпусціў усе гэтыя працэсы з-пад кантролю, цяпер пажынаюць плады.

«Сёння мы падрабязна разгледзім адну з сфер, куды лічбавая трансфармацыя пракралася вельмі глыбока, — гэта фінансавыя адносіны. Выкарыстанне лічбавых знакаў (токенаў) і крыптавалют стала штодзённым у многіх краінах свету. Іх прымаюць у якасці дадаткоўага плацежнага сродку побач з традыцыйнымі грашыма. У 2017 годзе мы першыя ў свеце спецыяльным дэкрэтам стварылі прававыя ўмовы для развіцця гэтых тэхналогій у Беларусі. За тры гады напрацавана канкрэтная практыка, атрыманы рэальны вопыт. Як мне дакладваюць, значных злоўжыванняў у гэтай сферы не дапушчана», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Гуканне буслоў

Родныя сёстры Наталля ВАЙТКО і Кацярына ЧАРНЫШОВА скончылі мастацкае вучылішча ў гарадскім пасёлку Мір (перад гэтым вучыліся ў адной школе і нават у адным класе), вярнуліся на радзіму і ўжо больш за дваццаць гадоў шчыруюць майстрамі па пляценні і інкрустацыі з саломы, вырабе сувенірнай прадукцыі ў Маладзечанскім раённым цэнтры рамёстваў. А яшчэ сёстры вучыліся ў педагагічным універсітэце і заўсёды ўдзельнічалі ў прэстыжных фестывалях і мастацкіх кірмашах раёна, вобласці і краіны, такіх як «Джынкі», «Вясновы букет», на святах песні і паэзіі ў Вязынцы і Ракуцёўшчыне. Сваім багатым досведам і грунтоўнымі ведамі Наталля і Кацярына шчыра дзеляцца на майстар-класах для землякоў у вёсках і агрогарадках. І ўсё для таго, каб захаваць і пашырыць традыцыю ўжывання саломы ў народным мастацтве. А сваіх буслоў — цудоўны твор, пагадзіцеся! — сёстры прысвячаюць дзівоснаму свету жывёл і вясноваму вяртанню птушак.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Асноўнай мэтай будаўнічага комплексу на найбліжэйшую пяцігоддзе стане жыллёвае будаўніцтва, у тым ліку і з дзяржнадтрымкай для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу. Асаблівая роля будзе таксама адведзена будаўніцтву арэнднага жылля. Увагу аддадуць і індывідуальнай забудове. Плануецца, што штогадовы аб'ём будаўніцтва такога жылля павінен скласці не менш за 40 % ад агульнага аб'ёму. Таксама стаіць задача пры праектаванні і будаўніцтве максімальна выкарыстоўваць у жылым фондзе электрычную энергію, яна будзе прымянцца для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыстаўавання ежы. У цэлым жа тэмпы будаўніцтва будуць расці, і да 2025 года мы павінны выйсці на 4,5 млн кв. м жылля штогод».

Размова па сутнасці

«Калі мы хочам рухацца далей, нам неабходна мяняцца, па-іншаму паглядзець на звыклыя рэчы»

Фота з архіва Андрэя САВІНЫХ.

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ, мабыць, адзін з самых вядомых і публічных дэпутатаў парламента. Яго часта запрашаюць на тэле- і радыёпраграмы, у яго бяруць каментарыі інтэрнэт-рэсурсы і друкаваныя выданні. Такая цікавасць з боку прэсы зразумелая: былы дыпламат мае багаты вопыт і дзеліцца ўласным нетрывіяльным меркаваннем аб шматлікіх працэсах у свеце і ўнутры краіны. У інтэрв'ю для нашага выдання Андрэй Савіных расказаў, што такое макрарэгіёны і чаму яны — дамінуючая тэндэнцыя новага светапарадку; растлумачыў, чаму ў Беларусі ёсць шанц увайсці ў ядро Еўразіі, і падзяліўся, якія казкі неабходна чытаць дзецям, каб выпрацаваць у іх прадпрымальніцкую жылку.

СТАР. 2

Справы жыццёвыя

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Аб чым часцей за ўсё пытаюцца ў камунальнікаў, і куды скардзіцца, каб заклікаць да адказу нядбайныя камунальныя службы

Кожны месяц жыхары шматкватэрных дамоў атрымліваюць рахункі за камунальныя паслугі. Многія аплачваюць свой рахунак не ўчытваючыся, іншыя ўважліва вывучаюць, каб зразумець, з якіх лічбаў складваецца сума «да аплаты», і супастаўляць з тым, што рэальна робяць камунальнікі ў іх доме і дварэ. Але як быць, калі камунальныя службы, на вашу думку, не выконваюць сваіх абавязкаў? Перш за ўсё, трэба звярнуцца ў службу, — скардзіцца: пісаць у Міністэрства ЖКГ.

Колькі зваротаў прыходзіць у Міністэрства ЖКГ штогод, на што скардзяцца нашы суграмадзяне, з якога рэгіёна Беларусі паступае больш за ўсё скаргаў і ці ўсе лісты і званкі не застаюцца без адказу, пра гэта мы спыталі ў **начальніка аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь Генадзя АКСЦІЛОВІЧА.**

СТАР. 5

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Месцаў у рэанімацыі няма...

У перапоўненых з-за каранавірусу рэанімацыях Бразіліі не засталося месцаў: такая сітуацыя назіраецца па ўсёй краіне. Пра гэта піша CNN.

Рэанімацыі 25 з 27 сталіц штатаў працуюць на мяжы магчымасцяў. Каб трапіць у бальніцу, некаторым даводзіцца чакаць у чарзе. Па даных тэлеканала, узровень загрузкі аддзяленняў інтэнсіўнай тэрапіі перавышае 80 працэнтаў, а дзесьці — 90 і нават 100. Штат Сан-Паўлу ўжо ўвёў надзвычайнае становішча. У паўднёвым штаце Рыу-Грандзі-ду-Сул аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі настолькі перагружаны, што найбуйнейшая клініка аднаго з гарадоў была вымушана адмаўляць новым пацыентам.

На мінулым тыдні ў Бразіліі было зафіксавана 12 818 новых смерцяў ад ускладненняў з-за COVID-19, а таксама больш за 464 тысячы новых выпадкаў заражэння. Гэтыя паказчыкі апярэдзілі колькасць смерцяў і заражэнняў у ЗША.

Партыя Меркель прайграе выбары?

Партыя Ангелы Меркель дасягае рэкордна нізкіх вынікаў у двух ключавых рэгіёнах на мясцовых выбарах у Германіі. Хрысціянска-дэмакратычны саюз набірае толькі чвэрць галасоў у паўднёва-заходніх землях Бадэн-Вюртэмберг і Рэйнланд-Пфальц. Традыцыйна іх жыхары актыўна галасавалі за партыю Меркель, хоць апошнія гады гэтыми рэгіёнамі кіравалі кааліцыі на чале з прадстаўнікамі «зялёных» і сацыял-дэмакратаў адпаведна.

Такія нізкія паказчыкі ХДС на цяперашніх рэгіянальных выбарах звязаны з шэрагам прычын, адзначае BBC. Калі пасля першай хвалі пандэміі немцы лічылі дзеянні ўрада эфектыўнымі, то цяпер, на фоне росту новых выпадкаў заражэння і павольнай вакцынацыі, яны расчараваныя ў федэральных уладах. Алею ў агонь падлілі і навіны пра тое, што некалькі дэпутатаў партыі ХДС атрымалі буйныя камісійныя ад дзяржаўных кантрактаў на набыццё медыцынскіх масак.

У верасні ХДС пойдзе на ўсеагульныя выбары без Ангелы Меркель.

Каштоўнасці Мёртвага мора

Фрагменты скруткаў з біблейскімі тэкстамі дзвюхтысячагадовай даўнасці выяўлены ізраільскімі археолагамі ў пячорах у раёне Мёртвага мора, таксама былі знойдзены манеты, шкілет дзіцяці, пахаванага 6 тысяч гадоў таму, і кошык, сплецены з раслінных матэрыялаў прыкладна 10,5 тысячы гадоў таму, паведаміла Ізраільскае ўпраўленне старажытнасцяў.

«Упершыню за прыкладна 60 гадоў археолагі выявілі (у раёне Мёртвага мора) фрагменты біблейскага скруткa. Скруткі, напісаны па-грэчаску, уключае ў сябе ўрыўкі з Кнігі дванаццаці малых прарокаў, у тым ліку кнігі Захары і Навума», — паведамляе агенцтва «РІА Новости».

Раскопкі вялося з 2017 года ў цяжкадаступных месцах — у некаторыя пячоры можна было трапіць толькі пры выкарыстанні альпінісцкага абсталявання, — і былі накіраваныя на прадухіленне разграблення старажытнасцяў у Іудзейскай пустыні. З тых часоў, як у канцы 40-х гадоў XX стагоддзя археолагі выявілі серыю манускрыптаў, датаваных I—III стагоддзямі нашай эры, якія маюць вялікае гістарычнае, рэлігійнае і лінгвістычнае значэнне, на працягу амаль шасці дзесяцігоддзяў новых рукапісаў не знаходзілі.

КАРОТКА

- Біяметрычныя пашпарты ўводзяцца ў Беларусі з 1 верасня. *(Больш падрабязна аб новых дакументах можна даведацца ў нумары газеты «Звязда» за 12 сакавіка.)*
- **Беларусь і Расія дамовіліся аб стварэнні трох вучэбна-баявых цэнтраў суменсай падрыхтоўкі.**
- Слухач магістратуры Універсітэта МНС стаў пераможнікам Усерасійскай навуковай канферэнцыі.
- **Дзень адчыненых дзвярэй пройдзе 20 сакавіка ў Ваеннай акадэміі Беларусі.**
- У Брэсцкай вобласці акцыю ў памяць аб спаленых вёсках правядуць у 14 раёнах.

Тонкі лёд

Улоў цаной у жыццё

Цёплае веснавое сонца пакрысе «пад'ядае» лёд. Нягледзячы на гэтую акалічнасць, на вадаёмы працягваюць масава адпраўляцца рыбакі. Вось і ў мінулыя выхадныя каля затокі ракі Свіслач у Гродзенскім раёне на лёдзе знаходзіліся дзясяткі аматараў падлёднага лову. Але наколькі ён цяпер трывалы?

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Па звестках Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, на сёння ў краіне амаль не засталося вадаёмаў, на якіх адзначалася б трывалае ледзяное покрыва. Яно і нядзіўна: усё-ткі апошнім часам назіраецца істотны «плюс», сваю лепту ўносяць і перыядычныя дажджы. А гэта значыць, што выратавальныя сем сантыметраў лёду, якія лічацца бяспечнымі для знаходжання на ім, няўхільна змяншаюцца, імкнуцца да нуля.

— Галаўны боль для нас у перыяд разбурэння лёду — гэта рыбакі, — кажа **начальнік аддзела выратавальна-выратавальнай службы Таварыства ратавання на водах Дзмітрый БАРАНОЎСКІ.** — Вось калі паглядзець даныя, напрыклад, па стане на 11 сакавіка, то прагулка па лёдзе стала прычынай гібелі дзесяці чалавек. З іх тры чалавекі выратавалі «зрэзаць» дарогу праз замерзлы вадаём. У Столінскім раёне 7-гадовы хлопчык загінуў на лёдзе меліяратыўнага канала 5 сакавіка. Астатнія шэсць выпадкаў прыходзяцца на падлёдную рыбалку.

СТАР. 5

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

ISSN 1990 - 763X

Прэзідэнт падпісаў указ аб Канстытуцыйнай камісіі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З ліку прадстаўнікоў рэальнага і фінансавага сектараў эканомікі ў камісію ўвайшлі генеральны дырэктар навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Інфапарк» Уладзімір Басько, старшыня праўлення ЗАТ «БСБ Банк» кандыдат эканамічных навук Сяргей Дубкоў, генеральны дырэктар ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ» Валерый Іванковіч, гендырэктар ТАА «Кіруючая кампанія холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» заслужаны работнік прамысловасці Беларусі Мікалай Мартынаў, старшыня праўлення СВК «Агракамбінат Сноў» заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі Мікалай Радаман.

Грамадскія аб'яднанні ў Канстытуцыйнай камісіі прадстаўлены старшынёй Беларускага саюза жанчын Аленай Богдан, дырэктарам інфармацыйна-аналітычнай установы «Круглы стол дэмакратычных сіл» Юрыем Васкрасенскім, старшынёй Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Ягорам Макарэвічам, старшынёй Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў Валерыем Міцкевічам, першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі Аляксеем Сокалам, дырэктарам інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» Аляксандрам Шпакоўскім.

З ліку прадстаўнікоў навукі і адукацыі ў склад камісіі ўключаны загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Беларусі Рыгор Васілевіч, выкладчык-стажор кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Бажэна Ярэміч, намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда доктар юрыдычных навук Наталля Карповіч, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ кандыдат юрыдычных навук Таццяна Маслоўская, намдэкана юрыдычнага факультэта БДУ кандыдат юрыдычных навук Арцём Пухай, галоўны саветнік аддзела эканамічнага аналізу кіраванння ўнутранай палітыкі Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў кандыдат юрыдычных навук Кацярына Рэчыц, намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь — кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў кандыдат юрыдычных навук Алена Сямашка.

Сферы культуры і спорту ў складзе Канстытуцыйнай камісіі прадстаўляць рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі доктар мастацтвазнаўства Кацярына Дулава, мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Тэатр-студыя кінаакцёра» народны артыст Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч мастацтваў Аляксанр Яфрэмаў, майстар спорту, член нацыянальнай каманды Беларусі па інваспорце Аляксей Талай, старшыня Беларускай федэрацыі веласпеднага спорту, заслужаны майстар спорту Наталля Цылінская.

ПВТ як рухавік прагрэсу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з тым, працягнуў ён, у свеце ўжо выпрацаваліся пэўныя правілы, накіраваныя на прадухіленне легалізацыі злачынных даходаў, недапушчэнне фінансавання тэрарызму і выключэнне перадумоў да разнастайнай крымінальнай дзейнасці.

«Усё гэта ўжо прысутнічае ў свеце, і мы неадлёка ад гэтага. Таму урад, Камітэт дзяржаўнага кантролю, Нацбанк мяркуюць, што трэба ўдакладніць некаторыя палажэнні заканадаўства і ўстанавіць необходны ўзровень кантролю над новай сферай фінансавых аперацый», — адзначыў кіраўнік краіны.

Таксама, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, лічбавыя тэхналогіі неабходна разглядаць з пазіцыі не толькі пагроз, але і магчымасцяў для развіцця. «Тым, хто пачне ламантаваць, што мы тут заціскаем, зачыняем, амаль што на ІТ зноў наступаем, на фінансавы рынак, хачу сказаць: размова ідзе аб цывілізаванным кантролі з аднаго боку. А з другога боку — мы хочам скарыстацца момантам і выкарыстаць для нашага развіцця гэты сегмент. Тое, што ў нас зроблена, ужо нямала. У краіне з'явілася новая і вельмі эфектыўная галіна эканомікі. Кампаніі, якія працуюць у Парку высокіх тэхналогій, на большасці эканамічных паказчыкаў значна апярэджваюць традыцыйныя галіны. І валютная выручка, якая паступае ў краіну дзякуючы іх рабоце, стала значным фактарам фінансавай, а значыць, і цанавой устойлівасці», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён у той жа час прапанаваў пагляцець шырэй: у ковідны перыяд мінулага года краіны сусветныя лідары надкрывалі трыльёны долараў для захавання сваёй эканомікі, падтрымкі бізнесу і людзей. «Нядаўна амерыканцы адобрылі аб'ём 1,9 трыльёна долараў для падтрымкі сваёй эканомікі. То-бок проста надкрывалі грошы. Я думаю, нам асуджаць іх за гэта не трэба. Гэта падтрымка ўсёй сусветнай эканомікі ў такі складаны перыяд. Але куды хлынулі гэтыя сродкі? Іх стаілі ўкладваць у тое, што мае найбольшую перспектыву да росту, прыбытковасці — у ІТ-індустрыю. Сфарміраваўся шалёны попыт, і кошт высокатэхналагічных кампаній вырас ад 200 да 800 працэнтаў. Ні адзін (законны) від дзейнасці не можа забяспечыць такі прыбытак. Нават кошт нічым не падмацаваннай крыптавалюты дасягнуў рэкордных значэнняў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка і працягнуў, што большая частка надрукаваных грошай да гэтага часу не звязана, і гэта кажа пра тое, што ў нас ёсць вялікі патэнцыял росту, калі зможам прыцягнуць іх у нашу краіну пры ўсіх складанасцях.

З гэтай прычыны ён папрасіў удзельнікаў нарады выказаць свае меркаванні аб тым, што і як можна палепшыць у нашым прававым полі, каб незадзейнічаны сусветны капітал мог знайсці свае выкарыстанне ў беларускім сегменце сусветнага ІТ-рынку.

Яшчэ адзін блок пытанняў нарады датычыўся бягучых праблем лічбавага развіцця краіны. «Рыхтуецца комплексны ўказ (у найблізэйшы час ён будзе дапрацаваны і падпісаны), які дазволіць засяродзіць існуючыя рэсурсы на некалькіх ключавых кірунках, стварыць адзіны орган дзяржаўнага рэгулявання, максімальна выкарыстоўваць вопыт Кітая ў пабудове лічбавага грамадства. Лічу, што рашэнне гэтых пытанняў зацягнулася», — выказаў меркаванне кіраўнік краіны.

Ён звярнуў увагу, што два гады таму вызначыліся: прынцыповыя падыходы да ІТ-сферы выпрацоўваюцца ўрадам, а іншыя дзяржаўныя органы павінны ім дапамагаць.

«Неабходна, каб усе прапановы былі вывераныя і глыбока прапрацаваны. Улетку мы іх павінны разгледзець на асобнай нарадзе», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

• У тэму

Кантроль за дзейнасцю крыптабіржаў ускладзены на адміністрацыю Парка высокіх тэхналогій

Пра гэта ў размове з журналістамі сказаў першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ. Згодна з агульнаеўрапейскімі правіламі, краіна павінна была замацаваць за дзяржаўным органам кантроль за дзейнасцю крыптаплатформаў і крыптабіржаў.

«Лагічна, што найбольш кампетэнтны і «разумеючы» ў сферы суб'ект — адміністрацыя Парка высокіх тэхналогій. І ўрад унёс прапанову, каб яна з'яўлялася такім кантрольным органам па дзейнасці крыптабіржаў лічбавых знакаў. Прэзідэнт падтрымаў прапанову ўрада і, мяркую, у хуткім часе такія функцыі будуць нададзены адміністрацыі Парка», — дадаў Мікалай Снапкоў.

Наконт прыцягнення сусветнага лічбавага капіталу ў беларускую ІТ-сферу ён адзначыў, што выгоды і магчымыя дывідэнды для краіны ад новых элементаў фінансавага рынку знаходзяцца ў працэсе вывучэння.

«У тым ліку і для гэтага кантрольная функцыя адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій. Таму што валодаючы сітуацыяй, разумеючы рух лічбавых капіталаў, механізмы і ідэалогію рэух, адміністрацыя будзе прапаноўваць магчымасці для развіцця краіны ў рамках глабальнай сеткі крыптабіржаў і лічбавых знакаў. Сказаць цяпер, як, калі, колькі гэта будзе і ў якія галіны пойдзе, вельмі складана», — канстатаваў першы віцэ-прэм'ер.

Мікалай Снапкоў прывёў прыклад рэальнай работы ўрада з лічбавымі знакамі. Ён паведаміў, што сёння Белэнешэканомбанк выпускае токены, якія з'яўляюцца каштоўнымі паперамі. Але токены выпускаюцца прасцей і менш звязаны з забяспечанасцю актывамі прадпрыемства. «Сёння токены — лічбавыя каштоўныя паперы — можна выпускаць прасцей і ў больш значных сумах. Гэта робіцца для забеспячэння прадпрыемства інвестыцыйнымі плынямі», — падкрэсліў першы намеснік прэм'ер-міністра.

За словах Мікалая Снапкова, увагу на нарадзе ўдзялілі і стварэнню адзінага органа, які будзе адказваць за развіццё лічбавага грамадства. Прэзідэнт, на яго думку, справядліва адзначыў, што працэс зацягнуты. І ўжо летам сістэмна пайдуць да парламентарыяў адзінага рэгулятара.

«Другое важнае пытанне — уцягненне ІТ-сферы, рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій у іншыя сферы эканомікі, каб забяспечыць рост вытворчасці і развіццё. Гэтыя тэмы будуць разглядацца летам. Адзначу, што нярпостая тэма рэгулятара, і не хацелася б уладу толькі змяніць назву, не змяняючы сэнсу і сутнасці. Мала стварыць толькі адзіны рэгулятар. Важна стварыць у кожным міністэрстве і галіне вертыкаль кампетэнцый, людзей, якія разумелі б, што неабходна рабіць у лічбавізацыі адлаведных галін», — завяршыў першы віцэ-прэм'ер.

Адказваючы на апошняе пытанне карэспандэнтаў наконт магчымасці абнаўлення Дэкрэта аб развіцці лічбавай эканомікі, Мікалай Снапкоў лаканічна дадаў, што «магчыма ўсё, галоўнае, каб было на карысць».

Парламенцкі дзённік

«КРАІНА ВАС ЧАКАЕ, ВЫ ЁЙ ПАТРЭБНЫЯ»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка уручыў пашпарты грамадзян нашай краіны юным жыхарам Віцебскай вобласці.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА уручае пашпарт Дар'і ЛЕБЕДЗЕВАЙ.

Фота Belta.by.

Ён адзначыў, што многія маладыя людзі прыехалі са школ яго дэпутацкай акругі, у якіх ён неаднойчы бываў, да таго ж спікер сам нарадзіўся ў Лёзненскім раёне Віцебшчыны, 14 гадоў кіраваў гэтай вобласцю, удзельнічаў у будаўніцтве і адкрыцці некаторых навучальных устаноў.

«У нас у Палаце прадстаўнікоў склалася добрая традыцыя ў дні святкавання прыняцця Канстытуцыі Беларусі ўручаць пашпарты грамадзян найлепшым прадстаўнікам моладзі, гэта адбываецца і ў іншых органах дзяржаўнага кіравання, — расказаў ён юным гасцям. — Гэта вельмі важны дзень, які запомніцца, бо вы атрымліваеце галоўны дакумент беларуса, і па вялікім рахунку гэта пуцёўка ў новае жыццё».

Кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента пералічыў поспехі, якіх ужо дасягнулі віцебскія старшакласнікі: добрыя адзнакі, удзел у прадметных алімпіядах, навуковых канферэнцыях, творчых конкурсах, перамогі ў спартыўных спаборніцтвах, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці сваіх школ. Ён нагадаў, што ў гэтым ёсць заслуга не толькі саміх дзяцей, але і іх бацькоў, педагогаў, сяброў.

«Але галоўныя вашы перамогі яшчэ наперадзе, — дадаў Уладзімір Андрэйчанка. — У кожнага свой шлях, але вы павінны разумець, што любы ваш занятак важны для Беларусі. Краіна вас чакае, вы ёй патрэбныя».

Цяперашняй моладзі ў нечым больш складана, чым папярэднім пакаленням: цяжэй стала зрабіць правільны выбар, занадта шмат інфармацыі, але лёгка ніколі не было, лічыць старшыня Палаты прадстаўнікоў.

«У рынцыпе ў жыцці так усё ўладкавана, што нішто не даецца лёгка, нішто не падае з неба. Каб штосьці мець, усюды трэба прыкласці працу, веды і ўпартасць, — лічыць парламентарый. — Старт вам усім дадзены адпаведны. Настаўнікі, бацькі, дзяржава стварылі для вас роўныя ўмовы. Астатняе залежыць ад вас».

Кім бы ні сталі цяперашнія школьнікі, трэба застацца патрыётамі Беларусі, заклікаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Уладзімір Андрэйчанка расказаў юным землякам пра значнасць Канстытуцыі Беларусі, якая была прынята 15 сакавіка 1994 года і пазней двойчы карэкціравалася, пра структуру і работу беларускага парламента, парламенцкія выбары, ролю Усебеларускага народнага сходу, пра дыялогавыя пляцоўкі, прапановы грамадзян Беларусі па карэкціроўцы Асноўнага Закона краіны, пра створаную напярэдадні Канстытуцыйную камісію.

«Канстытуцыя наша добрая на сёння, яна працуе, забяспечвае развіццё грамадства, дзяржавы, — сказаў ён. — Тым не менш час ідзе і трэба ўносіць нейкія змяненні. Таму людзі ўнеслі прапановы па змяненні нашага выбарчага працэсу, размеркавання паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам, урадам, парламентам, мясцовымі органамі ўлады».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў падлеткам, што тэрміны фарміравання прапаноў па змяненні Канстытуцыі пакуль не абазначаны, але, на яго думку, такая работа павінна завяршыцца ў жніўні-верасні бягучага года, каб у наступныя тры-чатыры месяцы можна было абмеркаваць праект абноўленага дакумента, дапрацаваць яго, і ў пачатку будучага года разам з выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў (яны павінны прайсці не пазней за 18 студзеня) была магчымасць правесці рэферэндум.

Парламентарый звярнуў увагу сваіх гасцей на важнасць дасягнення адзінства ў беларускім грамадстве.

«Думкі могуць быць розныя, але калі мы сабраліся, абмеркавалі, мы павінны дзейнічаць у адным кірунку», — сказаў ён.

У сустрэчы таксама ўдзельнічалі старшыня парламенцкай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла Макарына-Кібак і член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей Клішэвіч.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Калі мы хочам рухацца далей, нам неабходна мяняцца, па-іншаму паглядзець на звыклыя рэчы»

Задачы на пяцігодку і парадак дня макрарэгіёнаў

— Андрэй Уладзіміравіч, пачнём гутарку з вынікаў Усебеларускага народнага сходу (УНС). Якія пастулаты Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця вы б вылучылі як найбольш важныя?

— У рамках сходу на парадку дня былі два асноўныя пытанні — сацыяльна-эканамічнае развіццё і паслядоўнасць палітычных трансфармацый у краіне. Калі казаць пра першае, то ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, на мой погляд, выкладзены падыходы да рэформы дзяржаўнага кіравання эканомікай для яе больш эфектыўнасці. Ва ўмовах паўсюднага крызісу для нас вельмі важна забяспечыць адпаведны ўзровень дабаўленай вартасці, рэнтабельнасці ўсіх асноўных галін эканомікі. Так яна зможа ўстойліва перанесці ўсе выклікі і пагрозы. Праграмай закладзены таксама асновы эканамічнай мадэрнізацыі, абмяркоўваліся мадэлі кіравання, прыярытэтныя галіны.

Наконт палітычнай трансфармацыі — быў канкрэтна вымаляваны шлях мадэрнізацыі грамадства. Мы выходзім з таго, што ў апошнія 10-15 гадоў адбыліся істотныя змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Фактычна намаганнямі ўрада здзяйснялася планамерная рэформа ўсіх галін эканомікі ў інтарэсах людзей. Я маю на ўвазе з'яўленне сучаснага, актыўнага сектара прыватных прадпрыемстваў і сектара паслуг. Сёння 45 % працуючых занята ў прыватным сектары і 50 % падаткаў ён плаціць у бюджэт. Прыватныя прадпрыемствы дамінуюць у цэлых галінах: інфармацыйныя тэхналогіі, бытавыя і транспартныя паслугі, прыборабудаванне. Такія змены патрабуюць і рэформы палітычных адносін. У рамках Усебеларускага народнага сходу гэты кірунак вызначылі. Ён будзе ажыццяўляцца праз змяненне Канстытуцыі. Канстытуцыйная камісія, якая пачала дзейнічаць, будзе галосна рыхтаваць новы заканапраект, выносіць яго на абмеркаванне. Работа павінна быць праведзена да восені бягучага года. Потым новую рэдакцыю Канстытуцыі вынесуць на рэферэндум, які мяркуецца правесці ў пачатку 2022 года.

— Міністр замежных спраў Уладзімір Макей у сваім дакладзе на УНС распавёў аб стварэнні новай канцэпцыі знешняй палітыкі Беларусі. Якія падыходы вы б прапанавалі туды ўключыць?

— Канцэпцыя знешняй палітыкі павінна ўлічваць міжнародную абстаноўку — яна не можа быць адарвана ад рэальнасці. Зараз на планеце адбываюцца сур'ёзныя змены. Глабалізацыя адступае, і чалавецтва пераходзіць да стварэння макрарэгіёнаў. Гэта буйныя аб'яднанні суверэнных дзяржаў, якія сумесна вырашаюць палітычныя, эканамічныя і ваенныя праблемы. Макрарэгіёны становяцца дамінуючай тэндэнцыяй на наступныя 10—20 гадоў. Таму новая канцэпцыя знешняй палітыкі Беларусі павінна адказваць на пытанне, які макрарэгіён прыярытэтны для нас?

Выходзячы з забеспячэння ваеннай бяспекі Беларусі, выбар ужо зроблены — удзельнічаць у дзейнасці АДКБ і ўзмацняць саюз. Калі разглядаць палітычныя саюзнікаў, то, бясспрэчна, тут можна выбудаваць ірэархію прыярытэтаў. Першы — інтэграцыя з Расіяй у рамках Саюзнай дзяржавы і пашырэнне ўзаемадзеяння на іншыя краіны рэгіёна. У першую чаргу тыя, што ўваходзяць у ЕАЭС. На другім узроўні палітычных прыярытэтаў я размясціў бы краіны, што праводзяць знешнюю палітыку, якая не канфліктуе з інтарэсамі Беларусі. Да іх адносяцца Кітай, В'етнам, Індыя, Іран, Бразілія. Трэці прыярытэт — краіны, з якімі часам узнікаюць рознагалоссі, але ў адносінах з імі мы выходзім з прынцыпу добрасуседства і неабходнасці вырашаць глабальныя праблемы. Я маю на ўвазе краіны ЕС і ЗША.

Яшчэ адзін элемент стварэння макрарэгіёнаў — эканамічнае супрацоўніцтва. Тут трэба захоўваць старыя падыходы. Наш дабрабыт звязаны з дывэрсіфікацыяй экспарту, спробамі ўстанавіць як мага больш сувязяў у свеце.

Свет уступае ў эпоху, калі будучыня суверэнных дзяржаў будзе вызначацца не па адным, а ў міждзяржаўных саюзах краін, што маюць агульныя погляды, могуць адкрыта дамаўляцца, як жыць у гэтым саюзе. Вось такая канцэпцыя знешняй палітыкі нам неабходная.

— Калі мы ўжо закранулі тэму макрарэгіёнаў, як у іх рэальнасць укладваецца імкненне дзяржаў да суверэнітэту?

— Суверэнітэт — гэта дынамічная велічыня і права, якое не з'яўляецца абсалютным, бо ў міжнароднай супольнасці мы залежым ад агульных выклікаў. Суверэнітэт завязаны на праве краіны ўступаць у міжнародныя пагадненні, саюзы, дамоўленасці. Гэта не страта суверэнітэту, а імкненне да рэалізацыі сваіх мэт ва ўзаемадзеянні з партнёрамі. Калі мы ідзём на кампрамісе, мы ўзмацняем свой суверэнітэт. Наша ўзаемадзеянне з Расіяй, з ЕАЭС адбываецца па зразумелых прынцыпах. На прынцыпах, на якія мы зможам пагадзіцца і ў фарміраванні якіх можам удзельнічаць. Голас Беларусі будзе вельмі чуваць пры развіцці гэтага макрарэгіёна.

— Андрэй Уладзіміравіч, вы лічыце еўразійскую інтэграцыю найвышэйшым прыярытэтам нашай знешняй палітыкі. Але ў той жа час у гэтым аб'яднанні ёсць нявырашаныя пытанні. Як выбудоўваць інтэграцыю, калі ўнутрынацыянальныя інтарэсы дзяржаў перавязваюць над саюзнымі? Як еўразійская інтэграцыя ўкладваецца ў канцэпцыю макрарэгіёнаў?

— Калі кожная краіна цягне коўдру на сябе, гэта нармальна — дзяржавы «прыцярэюцца» ў дробязях. Але саюзнікаў аб'ядноўваюць агульная карціна развіцця і магчымасць ісці на кампрамісы. Агульны выйгрыш будзе большы, чым страты. Саюз — выгада для кожнага.

Цяпер з-за пандэміі паміж макрарэгіёнамі з'яўляюцца межы, таму бурацца ланцужкі раздзялення працы. Адначэляць іх неабходна ўжо ў маштабе аднаго макрарэгіёна. У Беларусі ёсць шанц увайсці ў ядро Еўразійскага макрарэгіёна са сваёй прамысловасцю, машынабудаваннем, сельскай гаспадаркай, транспартам. Граніцы такіх вялікіх аб'яднанняў дзяржаў не супадуць з граніцамі краін, што ў іх уваходзяць. Тут больш важныя не геаграфічныя межы, а межы эканамічнага, палітычнага, ваеннага ўплыву рэгіёна. То-бок ідзе працэс змены не межаў, а зон уплыву. Пры іх вызначэнні ёсць верагоднасць лакальных узбоеных канфліктаў.

Дарэчы, кожны макрарэгіён будзе рэалізоўваць дзве стратэгіі: адна накіраваная на ўзмацненне сябе, а другая — контрстратэгія — не даць іншым развівацца больш хутка.

Стратэгія спрыяння бізнесу

— У адным з інтэрв'ю вы падзяліліся сваім меркаваннем, што палітыка дзяржавы павінна быць накіравана на партнёрства з бізнесам, а любое спрэчнае пытанне павінна трактавацца на карысць дзелавой супольнасці. Што трэба зрабіць, каб гэты ваш тэзіс ажыццявіўся?

— Адказваючы на пытанне, я хацеў бы вярнуцца да тэзісаў Усебеларускага народнага сходу. Мы павінны забяспечыць эфектыўнасць нашага выбуховага комплексу. Трэба павялічваць прыбытковасць, рэнтабельнасць і эфектыўнасць прадпрыемстваў, пакольку беларуская эканоміка — яднанне буйных дзяржпрадпрыемстваў і прыватнага бізнесу розных памераў. Людзі, якія кіруюць падобнымі арганізацыямі, павінны працаваць ва ўмовах максімальнага спрыяння. Каб выбудоўваць стратэгію свайго развіцця, яны павінны ведаць: у выпадку неадкладнасці заканадаўства любое меркаванне будзе трактавацца на іх карысць. Дзяржаўныя органы, у сваю чаргу, павінны разумець, што іх задача — стварыць спрыяльныя ўмовы для паспяховага функцыянавання прадпрыемстваў, паставіць фірмы ўсіх формаў уласнасці ў роўныя ўмовы. Калі мы гэта зробім, перастанем ставіць інтарэсы міністэрстваў вышэй за інтарэсы прадпрыемстваў, тады, я думаю, дасягнем поспеху.

І я бачу кірункі рашэння гэтага пытання ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, дзе гаворка ідзе аб рэструктурызацыі буйных прадпрыемстваў, стварэнні холдынгаў і адпаведнага дзелавога клімату. Мы павінны выпрацаваць ментальнасць, калі дзяржслужачы разумее — ён працуе ў тым ліку і на інтарэсы айчыннага бізнесу, на ўзмацненне яго патэнцыялу, не важна, якой формы ўласнасці гэты бізнес.

Другі момант, які павінен стаць своеасаблівай нацыянальнай «рэлігіяй», калі мы факусіруемся на паляпшэнні ўсіх сфер жыцця Беларусі. Мы не кажам: «Гэты механізм працуе — і добра. Не будзем нічога змяняць». Мы кажам: «Калі ў нас з'яўляецца магчымасць палепшыць механізм, які добра працуе, мы павінны гэта зрабіць».

— З аднаго з вашых артыкулаў вынесла цікавую думку: «Галоўнае ўвасабленне зла і варожасці ў беларускіх казках — багаты пан, які прадаўлены як абсалютнае зло, без гонару і сумлення. Такім чынам, з дзяцінства закладваецца адмоўнае або як мінімум падазронае стаўленне да багацця і росквіту». Няўжо казкі могуць аказаць значны ўплыў на развіццё грамадства?

— Напрыклад, калі ўзяць нямецкія казкі, там хтосьці пакрыўджаны нешта робіць, спрабуе, дзейнічае, праз рызыку дасягае свайго. А ў рускіх — 30 гадоў ляжаў на печы, потым стаў Ільём Мурамцам. Гэтыя архетыпы дрэнна суадносяцца з рэальным светам. Такі вобраз засвойваецца ў раннім дзяцінстве. Калі чалавек вырастае, ён перапраўляе свае ўяўленні адпаведна з рэальнасцю. І атрымлівае адваротную інфармацыю: існуе іншы падыход — эксперымент, старанне, жаданне дасягнуць. Такі чалавек, мабыць, будзе сваім дзецям расказваць іншыя казкі, якія прывядуць у іх каштоўнасць прадпрымальніцтва, адказнасці.

Нам неабходна адмовіцца ад кансерватыўнай стратэгіі, калі грамадства нясе за чалавека большую адказнасць, чым ён сам за сябе. Адсюль узнікае сацыяльная пасіўнасць, адсутнасць ініцыятывы, чалавек не выкарыстоўвае ўсіх магчымасцяў, што дае жыццё. Падштурхнуць грамадзяніна да развіцця сваіх магчымасцяў, асвоення новых уменняў, паляпшэння ўласнага жыцця — гэта задача, якую неабходна вырашаць у крызіс. Я часта цытую такі выраз: «Рэформы робяць не тады, калі іх неабходна рабіць, а тады, калі іх нельга не рабіць». Калі мы хочам рухацца далей, нам неабходна мяняцца, па-іншаму глядзець на прывычныя рэчы.

— У грамадстве востра абмяркоўваюць стварэнне так званага закона аб «замежных агентах». Наколькі рэальная імплементацыя такога нарматыўна-прававога акта ў заканадаўстве Беларусі?

— На Усебеларускім народным сходзе прагучала думка, што Беларусь — апошняя самастойная краіна Еўропы. Гэта прыгожа і пачэсна, але небяспечна. Такая самадастатковая краіна становіцца аб'ектам прахватару кіравання. І для гэтага Еўрасаюзам, ЗША выдзяляліся апошнія 10 гадоў значныя грошы, каб сфарміраваць структуры, зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з Захадам. Гэты працэс прывёў да вострага ўнутрыпалітычнага канфлікту.

Дзяржава мае права ведаць, што пэўныя рухі, клубы фінансуюцца з-за мяжы для рэалізацыі нейкай мэты. Практыкаю паказвае, што гэта звычайна не альтруістычныя задачы. Фонды, якія існуюць на прыватныя грошы, праследуюць свае інтарэсы, звязаныя з узмацненнем рэсурсу ўплыву. Мы павінны ведаць, што такая работа ў нас правадзіцца і хто, якія і на чые грошы выказвае ідэі ў нашай краіне. На гэта і накіраваны Закон аб замежных агентах.

Мяркую, што законапраект мы распрацуем сумесна з Міністэрствам юстыцыі. На працягу года, верагодна, зможам вырашыць пытанне з яго прыняццем.

Публічная палітыка

— Вы, мабыць, адна з самых публічных асоб у беларускім парламенце. Чаму, на ваш погляд, дэпутаты неабходна імкнуцца размаўляць з прадстаўнікамі СМІ і грамадскасці?

— Няводная арганізацыя, установа не можа дазволіць сабе існаваць асобна — яны павінны інфармаваць максімальна вялікую колькасць людзей аб мэтах, задачах сваёй дзейнасці, фарміраваць станоўчую рэпутацыю. Гэта магчыма зрабіць праз зносіны з прэсай, грамадзянамі.

У парламенце добра пастаўлена практыка сустрэч у працоўных калектывах. Але неабходна дадаваць і сучасныя сродкі інфармацыі, у тым ліку сеткавыя рэсурсы. Мне гэта рабіць працаей, бо пэўны час я займаў пасаду прэссакратара ў Міністэрстве замежных спраў. Я добра разумею, што такое публічная дыпламатыя, публічная палітыка, як яны працуюць і якім чынам звязаныя ўяўленне людзей і рэальны змест любой палітычнай дзейнасці.

— У працяг тэмы. Вы — актыўны карыстальнік сацыяльных сетак. Вашу персанальную старонку можна знайсці ў «Фэйсбуку», на «Ютубе». У чым карысць такіх інструментаў у зносінах з электаратам? Як часта вы сутыкаецеся з крытыкай у сацсетках і як на яе рэагуеце?

— Я ўспрымаю і «Фэйсбук», і «Ютуб» у першую чаргу як магчымасць вылажыць на ўмоўную вітрыну свае ўяўленні аб гэтай рэальнасці, а далей — справа людзей навокал. Калі вы захочуць, возьмуць гэтыя ідэі. Не — пакінуць ляжаць там, дзе яны ёсць. Адзначу, што эфектыўная прапаганда сваіх думак можа быць толькі мяккай. Жорсткая прапаганда ў сучасным інфармацыйным грамадстве не працуе.

Сацыяльныя сеткі сёння нельга разглядаць як пляцоўку для глыбокіх прафесійных дыскусій. Па-першае, такі фармат абмену інфармацыяй не дазваляе гэтага дасягнуць. Па-другое, сацыяльныя сеткі для вялікай колькасці людзей — магчымасць выказаць свой пратэст, нязгоду. Там магчыма сутыкнуцца з нематываванай агрэсіяй, з суб'ектыўнымі, неабгрунтаванымі ўяўленнямі пра цябе і тваю дзейнасць. На гэта не трэба звяртаць увагі.

З іншага боку, сацыяльныя рэсурсы ў інтэрнэце дазваляюць даносіць і станоўчы сігнал — тое, што ты лічыш каштоўным. Важна не тое, як канкрэтны чалавек у пэўны момант адрэагаваў на пост, а што засталося ў яго памяці.

Дыпламат і дэпутат

— За амаль шэсць гадоў вашай работы ў пасольстве ў Турцыі тавараабарот паміж нашымі краінамі вырас на 50 %. Гэта рэальны факт, нават нягледзячы на адмоўнае сальда для Беларусі. Якія яшчэ поспехі ва ўзаемадзеянні краін вы можаце адзначыць за час вашай работы паслом?

— З таго, што мне ўдалося зрабіць, у першую чаргу нагадаю аб устанаўленні ўзаемадзеяння на вышэйшым узроўні. Я спрыяў арганізацыі некалькіх вельмі важных візітаў, у тым ліку першага ў гісторыі двухбаковых адносін візіту Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана ў Беларусь. Наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка таксама падчас маёй кадэнцыі пасля перапынку ў 20 гадоў зноў прыехаў у Турцыю. Гэтыя кантакты далі штуршок развіццю партнёрства амаль ва ўсіх галінах.

Значнымі праектамі лічу адкрыццё зборачнай вытворчасці беларускіх трактароў пад Анкарой, спецыяльнае айчыннай снегаборачнай тэхнікі ў горны раён Эрзурума, дзе зіма цягнецца да 8 месяцаў у годзе. Там наша тэхніка стала знаходкай. Мы з туркамі асвойваем Арктыку — ёсць рэальная праграма аб узаемнай дзейнасці. Яны вельмі цікавяцца нашым арктычным вопытам. За гэты перыяд было рэалізавана яшчэ шмат маленькіх праектаў на кантактах паміж прадпрыемствамі, людзьмі, культурнымі калектывамі.

— У чым падабенства і прынцыповыя адрозненні работы ў сферы парламенцкай дыпламатыі і на дыпламатычнай рабоце ў МЗС?

— У дыпламатычнай рабоце ты строга «заточаны» на заключэнне пагаднення. Любы дыпламат мэтанакіравана працуе на дасягненне кампрамісу, імкнецца абыходзіць канфліктныя зоны і знаходзіць рашэнні, што могуць зблізіць два бакі. Гэта вельмі складаная, філігранная работа. Без яе нікуды не дзенешся, бо свет пазбягае вялікай колькасці ваенных канфліктаў дзякуючы намаганням дыпламатаў.

У парламенцкай дыпламаты больш магчымасцяў. Тут часам мае сэнс канфлікт, каб высветліць адносіны. Разыходжанні і пікіроўкі могуць быць інструментам выпрацоўкі погляду, як рухацца наперад. Парламенцкая дыпламатыя працуе не на дасягненне імгненнага рашэння, а на ўзгадненне ўяўленняў аб каштоўнасцях. Гарызонт планавання шырэйшы — мы працуем не над канкрэтнымі практычнымі рашэннямі, а на фарміраванне адзінага погляду на каштоўнасці.

— Уладзімір Макей у адным з інтэрв'ю сказаў, што каля 5-6 % супрацоўнікаў МЗС звольнілася падчас пратэсных падзей, і адзначыў, што дыпламатычная служба падобная да ваеннай. Як, на ваш погляд, правільна дзейнічаць дыпламату, які не падзяляе пазіцыю дзяржавы?

— Калі чалавек працуе ў МЗС, перад ім пастаўлена галоўная задача — забяспечваць спрыяльныя знешнія ўмовы для паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэтым усё абмяжоўваецца. Я не бачыў ніводнага замежнага дыпламата, які б замест выканання сваіх прамых абавязкаў пачынаў крытыкаваць уласны ўрад ці асобнае міністэрства. Гэта нонсэнс, так нідзе ў свеце не бывае. Так, яны могуць прапаноўваць змены, але іх функцыя дакладна вызначана: на знешнім полі імкнецца забяспечыць спрыяльныя ўмовы для ўласнай краіны.

Калі дыпламат бачыць шмат праблем унутры краіны, ён заканчвае працаваць у МЗС, ідзе ў іншую сферу — напрыклад, у палітычную партыю, і займаецца ўнутранымі развіццём дзяржавы. Тады ў яго з'яўляецца права крытыкаваць і выказваць публічна свае прапановы. Адзін з такіх варыянтаў — маё рашэнне пайсці ў парламент. Я ў Палаце прадстаўнікоў, каб займацца ўдасканаленнем нашай унутрай сістэмы, каб яна лепш адказвала на знешнія выклікі. Мне гэта цікава, я лічу гэта важным. Але я не стаў кідаць камяні ва ўласную краіну, калі мне даручылі работу за мяжой па абароне інтарэсаў гэтай жа краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

Сяўба

ПРАЦАВАЦЬ З КАМФОРТАМ

Работнікі сельгаспрадпрыемства «Гнезна» Ваўкавыскага раёна вясновы сезон пачынаюць на новай тэхніцы

Сярод тых, хто сядзе за руль новага трактара, і перадавік гаспадаркі Аляксандр ЯНУШКЕВІЧ. Хоць па прафесіі ён інжынер-механік, мае вышэйшую адукацыю, але цяга да зямлі перамагла. І вось ужо больш за пятнаццаць гадоў Аляксандр выходзіць у поле. Вясной — каб рыхтаваць глебу і сеяць зерне, летам — на жніве за штурвалам камбайна. Яго добрасумленная праца і адданасць справе высока адзначаны дзяржавай. Год таму земляроб быў узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

Сёння механізатар пастаянна ў полі. Вывозіць на палі арганіку, вядзе падкормку шматгадовых траў, займаецца ўнясеннем мінеральных угнаенняў перад пасевам збожжавых культур. Добрым памочнікам жму стаў новы трактар BELARUS — 1523.3 Мінскага трактарнага завода. Дарэчы, за ім Аляксандр Янушкевіч уласнай асобай ездзіў у Смаргонь, дзе знаходзіцца гандлёвы дом філіяла ААТ «МТЗ». Тэхніка прызначана для выканання поўнага спектра сельгаспрацот — ад падрыхтоўкі глебы пад сяўбу да ўборачных і транспартных аперацый. Дзякуючы ўніверсальнасці і дадатковаму абсталяванню, трактар можа выкарыстоўвацца з многімі сельгасмашынамі і прычэпнымі агрэгатамі. Разам з вытворчымі якасцямі механізатар ацаніў і ўмовы працы. Галоўнае — наяўнасць кандыцыянера. Гэта тое, што адсутнічала ў яго папярэднім трактары.

— Кабіна вельмі прыгожая, зручна сядзець, цудоўны агляд. Але самы важны для механізатара элемент — кандыцыянер. У папярэдніх мадэлях трактароў МТЗ гэтага не было. Цяпер іх тэхніка можа стаць у адзін шэраг з імпартнымі аналагамі. Наяўнасць кандыцыянера гаворыць аб сучасных умовах працы на карысць вытворчасці, — прызнаецца механізатар.

У гаспадарцы да новага сезона падышлі з абноўленым машынна-трактарным паркам. Разам з Аляксандрам Янушкевічам новыя трактары, у тым ліку энерганасычаны, атрымалі яшчэ два механізатары. Акрамя таго, тут набылі і новыя агрэгаты — лучшыльнік, 10-метровы культыватар, касу, разрыхляльнік. Па словах галоўнага агранома Наталлі Еўтух, новая тэхніка заменіць старыя аналагі, каб людзям было камфортна працаваць. На яе думку, цяпер варта звяртаць увагу на ўмовы працы, каб прыцягнуць у сельскую гаспадарку новыя кадры, бо праблема іх недахопу існуе.

— Аляксандр Янушкевіч — адзін з тых работнікаў гаспадаркі, хто складае наш «залаты фонд», — расказвае Наталля. — Ён — перадавік вытворчасці: і на сяўбе, і падчас уборкі штогод першы. Нездарма яго праца ацэнена высокай узнагародай — медалём «За працоўныя заслугі». Гэта добры прыклад і для яго трох сыноў. У гаспадарцы працуе і жонка Аляксандра Янушкевіча. Гэта сям'я сапраўдных прафесіяналаў.

Да новага веснавога сезона сельгаспрадпрыемства «Гнезна», можна сказаць, падрыхтавана. Увесь машынна-трактарны парк прайшоў тэхнічны агляд і гатовы да работы. Падрыхтаваны і насены фонд. Сёлета мяркуецца засеяць збожжавымі 800 гектараў раллі. Пасяўную кампанію ў гаспадарцы плануюць пачаць на наступным тыдні. У паралюванні з мінулым годам тэрміны крыху пазнейшыя.

У ліку першых пачнецца сяўба гароху — новай культуры, якую ў гаспадарцы пачалі культываваць два гады таму. Пад яе пойдзе 200 гектараў раллі. Гарох — добрая дабаўка да жывёлагадоўчага корму. Частка ўраджаю пойдзе ў насенны фонд. Паступова будзе весціся сяўба збожжавых і зернебабовых культур. Мяркуецца, што гаспадарка абыдзецца сваімі сіламі, без прыцягнення кадраў збоку.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

• Наша даведка

У Гродзенскай вобласці для правядзення палявых работ будзе задзейнічана 6,3 тысячы механізатарскіх кадраў. Забяспечанасць складае крыху больш за 90 працэнтаў. Для арганізацыі работ будуць прыцягнуты выпускнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, вучэбных цэнтраў. На дапамогу ў гаспадаркі выедзе каля 200 чалавек з прамысловых прадпрыемстваў.

• Кампетэнтна

Тэма падрыхтоўкі да веснавых палявых работ была закранута і падчас прамой лініі, якую правёў у канцы мінулага тыдня першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Жук. Адзначаліся, што аграрыі Гродзеншчыны летась сабралі багаты ўраджай, дасягнулі высокіх эканамічных паказчыкаў. Ці магчыма чакаць добрага выніку ў сёлетнім сезоне? Як адзначыў чыноўнік, цяпер сур'ёзную ўвагу необходна аддаць падрыхтоўцы глебы, бо, нягледзячы на снежную зіму, вільгаці ўсё роўна не хапае.

— Зараз аграрыі актыўна набываюць і рыхтуюць угнаенні, насенне, палівы для тэхнікі. Плануецца, што ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны вясенняя пасяўная кампанія пачнецца дзесьці пасля 20 сакавіка, і для гэтага няма ніякіх перашкод. Падрыхтоўка вядзецца згодна з планам, — падкрэсліў Іван Жук.

Ва ўрадзе

Масавы старт пасяўной чакаецца пасля 25 сакавіка

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмеркавалі гатоўнасць краіны да вясновых палявых работ

«У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай «Аграрны бізнес» вытворчасць прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі ў 2021 годзе павінна павялічыцца на 2,4 працэнта ў параўнанні з мінулым годам, — нагадаў удзельнікам пасяджэння прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА. — У гэтай сувязі галоўная задача, якая сёння стаіць перад усёй аграрнай галіной, ад Мінсельгасхарча да выканкамаў, — правядзенне вясновa-пасяўных работ на высокім арганізацыйным і тэхналагічным узроўні».

Кіраўнік урада заўважыў, што падобная задача стаіць напярэдадні кожнай пасяўной кампаніі, разам з тым аналіз сітуацыі на цяперашні момант, па яго словах, сведчыць, што не ўсе рэгіёны прымаюць неабходныя меры.

«Недастатковымі тэмпамі ідзе назапашванне мінеральных угнаенняў, менш за леташні ўзровень вывезена на палі арганікі, — канстатаваў ён. — Найбольшыя пытанні ўзнікаюць да Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Такі стан недапушчальны. У нас ёсць усе магчымасці для правядзення якаснай пастаўкі мінеральных угнаенняў беларускімі хімічнымі арганізацыямі».

На вясновыя палявыя работы прадугледжаны бюджэтныя сродкі ў памеры 311 мільёнаў рублёў, ільготных крэдыты банкаў у памеры 561 мільёна рублёў і крэдыты з субсідзіраваннем працэнтнай стаўкі на дзяржзаказ для давання авансаў каля 250 мільёнаў рублёў, паведаміў прэм'ер-міністр.

Акрамя таго, па словах Рамана Галоўчанкі, сёлета ўрад унёс на разгляд кіраўніка дзяржавы прапановы па фінансаванні дадатковай закупкі мінеральных угнаенняў і гаруча-змазачных матэрыялаў на суму да 300 мільёнаў рублёў і выдзяленне дадаткова 57 тысяч тон паліва, вяртанне якога адбудзецца за кошт бюджэту.

«У шэрагу рэгіёнаў узнікаюць складанасці са своечасовай падрыхтоўкай машынна-трактарнага парку да вясна-палявых работ», — адзначыў кіраўнік урада і нагадаў, што да 25 сакавіка ўзровень такой гатоўнасці павінен быць не ніжэйшы за 95 працэнтаў.

Плошчы пад сяўбу сёлета складуць 2,4 мільёна гектараў, паведаміў журналістам міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко. Азімыя пасеяны на плошчы 1,8 мільёна гектараў.

«Мы будзем забяспечваць вытворчасць збожжа 8,5 мільёна тон, 5 мільёнаў тон цукровых буракоў, 1,1 мільёна тон бульбы, 700 тысяч тон рапсу, 130 тысяч тон агародніны, 170 тысяч тон пладоў і ягад, 55 тысяч тон ільнованалкна, — сказаў ён. — На сёння сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны на 100 працэнтаў забяспечаны насеннем для праведзення вясна-палявых работ. У іх будуць удзельнічаць 37 тысяч механізатараў».

Забяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі зараз складае 37 працэнтаў ад патрэбы, дадаў міністр. Разам з тым ён выказаў упэўненасць, што сёлетняй вясной графікі ўнясення ўгнаенняў будуць захаваны.

У гэтым годзе вясна больш позняя, чым летась, тым не менш работы на палях ужо пачынаюцца (вывяз арганікі), масавы старт пасяўной чакаецца пасля 25 сакавіка, сказаў Іван Крупко. Тэхнікі ў краіне дастаткова, каб правесці сяўбу ранніх збожжавых і зернебабовых за 10 дзён, запэўніў ён. Пасеў яравога рапсу будзе павялічаны на 5 працэнтаў з улікам запатрабаванасці рапсавага алею на знешніх рынках, астатнія культуры плануецца пасеяць у леташніх аб'ёмах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ваўкавы выгляд

Не толькі надоі і прывагі, але і прыгажосць

Вясновы працоўны дэсант у складзе спецыялістаў гаспадаркі разам з жывёлаводамі наводзіў парадак на ферме

11.3. Имена победителей призов Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте Рекламной игры igrax30.by на следующий рабочий день после проведения розыгрышей Призов.

12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.

12.1. Победители Рекламной игры извещаются Организатором о выигрыше посредством звонка по телефонному номеру, указанному при оформлении Карты, в течение 5 рабочих дней, следующих за днем проведения розыгрышей Призов. Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей SMS-сообщением по телефону, указанному при оформлении Карты.

12.2. Для получения приза Победитель не позднее 14 мая 2021 года (включительно) должен предоставить Организатору следующую информацию:

- отсканированные копии страниц паспорта с 31-й по 33-ю, а также копию страницы паспорта с указанием адреса регистрации либо страницы вида на жительство с аналогичными сведениями;

- номер текущего (расчетного) банковского счета, доступ к которому обеспечивается Картой;
- контактный номер телефона.

Указанные данные для получения приза Победитель может

Парадак на зямлі

ПАСЛЯЗІМОВАЯ ПРЫБОРКА СТАЛІЦЫ

Месячнік па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні населеных пунктаў распачаўся 15 сакавіка. Падчас прэс-канферэнцыі ў БелТА спецыялісты паабяцалі, што ямкі са сталічных дарог знікнуць да 1 мая, а ў кожным раёне Мінска ад пяці да дзесяці вуліц займеюць новае пакрыццё. У сталічных дварах цягам сакавіка-красавіка, як плануецца, высадзяць звыш 4000 дрэў і больш за 13 тысяч кустоў.

Праграма добраўпарадкавання Мінска складзена адміністрацыямі раёнаў з улікам восеньскага агляду, а таксама скаргаў і зваротаў грамадзян з пажаданнямі. У яе ўваходзіць абрэзка дрэў, рамонты лесвіц, пешаходных сцежак, зялёных зон, рамонты асфальтавага пакрыцця, паведаміў **Аляксандр РАКАЎШЧЫК, начальнік управлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама:**

*— Да гэтай работы па замацаваных тэрыторыях падключаць таксама арганізацыі і прадпрыемствы школы, ВНУ. Мяркуецца, як і штогод, праводзіць суботнікі (першы ўжо прайшоў 13 сакавіка. — **Аўт.**). Сёлета пачнуцца капітальныя рамонты з комплекснym добраўпарадкаваннем дварої пакварталь на. Упор у 2021-м зроблены менавіта на тое, каб навесці парадак у людзей пад вокнамі. Пры гэтым будуць задзейнічаны ўсе рэсурсы: ад дворнікаў да фінансавых укладанняў.*

У дварах актывізавана работа на навядзенні парадку пасля таяння снегу: прыборка выпадковага смецця, лістоты, якая засталася з восені. Ва ўсіх ЖКГ раёнаў распрацаваны паадрасныя мерапрыемствы і віды работ (з удзелам насельніцтва) у месцах агульнага карыстання жыллёвага фонду, расказала **Настасся ВАРАБ'ЁВА, наменік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні жыллёвага фонду Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— Запланавана капітальна адрамантаваць 15 дваровых тэрыторый: дзве ў Цэнтральным раёне сталіцы, і па адной-дзве — у астатніх. У 723 дварах мае адбыцца бягучы рамонт. Тут будуць адрамантаваны пешаходныя сувязі і іншыя аб'екты знешняга добраўпарадкавання: сцежкі, газоны, абсталяванне на дзіцячых пляцоўках, зялёныя насаджэнні.

Добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый робіцца не толькі за кошт бюджэту, але і за грошы грамадзян. У Мінскай вобласці гэта адбываецца досыць эфектыўна, дадаў **Арцём ЛАБКО, першы намеснік генеральнага дырэктара Жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскай вобласці:**

— Летась мы планавалі прывесці да ладу за кошт бюджэту 118 двароў, а з дапамогай жыхароў добраўпарадкавалі ажно 490. Сёлета ў планах зрабіць яшчэ 86 двароў, але і гэтая лічба, пэўна, будзе большая.

Наводзіцца парадак і ў кантэйнернай гаспадарцы Мінска. Запланавана замена, афарбоўка, рамонт і прывядзенне ў належны тэхнічны стан не толькі кантэйнераў, але і ўсіх аб'ектаў знешняга добраўпарадкавання. Распачата азеляненне тэрыторый, якое адбываецца ў тым ліку ў межах акцыі «Зялёны двор разам» (высаджана ўжо 57 дрэў па заяўках жыхароў), падкрэсліла Настасся Вараб'ёва:

— Не спыняецца работа (сумесна з РУУС і Дзяржаўтаінспекцыяй) па кантролі за выкананнем правілаў паркоўкі аўтамабілістамі і правілаў выгулу хатніх жывёл. За парушэнні праводзіцца прафілактычная работа, прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці.

Выбоін быць не павінна

Кіраўніцтва Мінгарвыканкама аператыўна адрэагавала на наступствы зімы, у прыватнасці на крытычную ямачнасць на дарогах, на ліквідацыю якой выдзелілі адпаведныя сродкі і штотыднёва аналізуюць, як ідзе работа, адзначыў Аляксандр Ракаўшчык.

Спецыялісты «Рамаўтадара», асфальтабетонны завод і ўсе структурныя падраздзяленні прадпрыемства працуюць кругласутачна без выхадных з лютага. Ужо адрамантавана звыш 41 тысячы кв. м. А памер усёй плошчы, якую эксплуатуе, прыбірае і рамантуе «Рамаўтадар» і структурныя падраздзяленні, — 22 млн кв. м, запэўніў **Дзяніс ГЛІНСКІ, генеральны дырэктар аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама»:**

— Сёння мы выкарыстоўваем літыя асфальтабетонныя сумесі, якія дазваляюць працаваць пры нізкіх тэмпературах. Як толькі сярэднясутачная тэмпература перавысіць 5 °С, пачнём карыстацца звычайнымі гарачымі асфальтабетоннымі сумесямі, згодна з тэхналогіяй правядзення работ. Для гэтага ўсё гатова: тэхніка, людзі, сродкі. Кругласутачна працуе таксама і Дзяржатамнагляд. Калі выяўляецца брак, арганізацыя ліквідуе яго за свой кошт.

Суровая зіма ўнесла значныя карэкціроўкі ў работу ў 2021 годзе, пагадзіўся Арцём Лабко:

— У сталічнай вобласці першапачаткова планавалася ахапіць бягучым рамонтам каля 49—50 тысяч кв. м, а цяпер план ужо каля 53 тысяч кв. м, і лічба будзе павялічвацца, бо агляды працягваюцца.

На балансе «Мінскаблдарбуда» — арганізацыі, якая ўтрымлівае і рамантуе мясцовыя дарогі сталічнай вобласці, — каля 16 тысяч кіламетраў дарог, палова з якіх (8300 км) асфальтаваныя. Найбольшая частка работ у арганізацыі зараз — таксама ямачны рамонт.

*— У сакавіку ў нас асноўная работа зімовае ўтрыманне і рамонт. Амаль штодня на дарогах працуе па 45—50 брыгад. Для работы выкарыстоўваецца складзіруемая арганамінеральная сумесь. Ужо ліквідавана больш як 5,6 тысячы кв. м ямачнасці, аднак яшчэ каля 4 тысяч кв. м праблемных застаецца, — падзяліўся **Валянцін ВОЎЧАНКА, начальнік аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі дарожнага руху «Мінскаблдарбуда».***

Зрэшты, пакрыце пачынаюць мінскаблдарбудаўцы займацца і ўборкай смецця. А з павышэннем тэмпературы возьмуцца ўкладваць асфальтабетонную сумесь, якую вырабляюць 27 установак прадпрыемства.

Сёлета таксама збіраюцца замяніць вялікую колькасць асфальтабетоннага пакрыцця на дарогах Мінска. У кожным раёне плануюць «перааспрануць» у сярэднім 5-10 вуліц, а на пуцеправодах падчас бягучага рамонту мяркуюць замяніць пакрыццё, поручні, дэфармацыйныя швы. Гэта, пэўна, стварыць некаторыя цяжкасці для аўтамабілістаў, аднак работа будзе весціся круглясутачна, абяцаюць дарожнікі. Дарэчы, спіс вуліц для рамонту з'явіцца ў канцы сакавіка.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Тонкі лёд

Усяго з пачатку гэтага года ў Беларусі правалілася пад лёд і патанула 20 чалавек. З іх чацвёра — непаўналетнія.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напрыклад, у возеры Боркі Вілейскага раёна ў другі дзень 2021-га патанулі адразу два рыбакі. Аднаму з іх было 59 гадоў, другому — 70. Мяркуецца, што спачатку пад лёд пайшоў старэйшы рыбак. Маладзейшы паспрабаваў яго выратаваць, але не даў рады.

...Як гэта ні парадаксальна гучыць, але менавіта лёд з палонкамі і прыцягвае да сябе рыбакоў. Сакрэт тут вельмі просты. Справа ў тым, што кісларод растварэцца непасрэдна ў вадзе, што вабіць рыбу. Але разам з тым і рызыка для жыцця тут становіцца максімальнай.

— Да таго ж на стан лядзянога покрыва вельмі ўздзейнічаюць пастаянныя праходжанні температуры паветра праз нулявую адзнаку. Асабліва гэта небяспечна на рэках, дзе існуе цячэнне. Структура лёду пакрысе разбураецца, ён становіцца рыхлым, крышыцца і ў рэшце ператвараецца ў шарош. Таму нечакана праваліцца ў ваду можна вельмі лёгка. А з улікам таго, што тэмпература вады зараз не нашмат вышэйшая за нулявую адзнаку, у чалавека ёсць літаральна некалькі хвілін на тое, каб хтосьці дапамог яму выбрацца з палонкі.

У канцы гэтага тыдня зноў чакаецца невялікае пахаладанне, пойдзе снег. Пад ім заўважыць прамавізну ці рыхлы лёд будзе амаль немагчыма. Таму лепш усё ж устрымацца ад выхаду на вадаёмы. Прынамсі, да будучай зімы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Азбука бяспекі

Секунды жыцця

За два месяцы на чыгуначных пуцях траўміраваны 17 грамадзян. Гэта на тры выпадкаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Пацярпелі 17 чалавек, 10 з якіх траўміраваны смяротна. 29 працэнтаў пацярпелых знаходзіліся на аб'ектах чыгуначнага транспарту ў стане алкагольнага ап'янення.

Па-ранейшаму асноўныя прычыны няшчасных выпадкаў — парушэнне правілаў бяспекі, неапраўданая рызыка, спешка і бестурботнасць. Большасць выпадкаў невытворчага траўматызму адбываецца з-за знаходжання грамадзян у зоне чыгуначных пуцей у стане алкагольнага ап'янення, выкарыстання навушнікаў, размоў па мабільным тэлефоне, парушэнні кіроўцамі правілаў дарожнага руху пры пересячэнні чыгуначных пераездаў і г. д.

БЧ чыгункі раз звяртае ўвагу на тое, што наезд на пешахода, які рапцам з'явіўся на шляху цягніка, прадухіліць практычна немагчыма, бо яго тармазны шлях складае больш за кіламетр. Акрамя таго, пры руху з хуткасцю 120 кіламетраў у гадзіну за адну секунду састаў пераадольвае 33 метры, а пешаходу, каб перайсці чыгуначныя пуці, патрабуецца не менш за пяць-шэсць секундаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прафарыентацыя

Работа не для слабых

Гомельскія школьнікі пабывалі ў ролі следчых

Навучэнцы гомельскай гімназіі № 58 імя Ф. Гааза сустрэліся з супрацоўнікамі Следчага камітэта. Галоўная ідэя нефармальнага мерапрыемства — расказаць вучням аб рабоце ведамства, аб умовах паступлення і навучання ў асноўнай установе адукацыі па падрыхтоўцы следчых і экспертаў — Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь.

На пытанні гімназістаў адказваў следчы Павел Емяльянаў, які нядаўна скончыў ВНУ. Першае, пра што спыталі школьнікі: ці вызваляюцца курсанты ад тэрміновай службы ў войску. Павел пацвердзіў: тэрмін навучання ідзе ў залік, тэрміновую службу праходзіць не абавязкова, але можна, а ўжо пасля яе паступіць у акадэмію. Праўда, на агульных умовах. З бонусаў, якія дзяржава дае курсантам, Павел назваў павышанае ў параўнанні з грамадзянскай стыпендыяй грашовае забеспячэнне і поўнае дзяржаўнае забеспячэнне — ад харчавання да абмундзіравання і пражывання ў казарме. Прынамсі, калі сярэдні бал быў дастаткова высокі, курсанту могуць дазволіць нават жыць на здымнай кватэры ў Мінску. Сам Павел Емяльянаў такую магчымасць меў, але свядома застаўся на ўсе чатыры гады ў казарме са сваімі таварышамі.

Яшчэ адзін плюс — абавязковае размеркаванне на першае месца службы, а па прыбыцці — пазачарговае забеспячэнне арэндным жыллём, ільготнае крэдытаванне. Практычна ўсіх накіроўваюць у падраздзяленне, куды абітурыент звярнуўся першапатачкова для афармлення дакументаў і дзе яго суправаджалі ў перыяд правядзення ўступнай кампаніі. Такая работа праводзіцца і Гомельскім гарадскім аддзелам Следчага камітэта.

— Лепш звярнуцца загадзя. Бо перад паступленнем патрабуецца яшчэ прайсці медыцынскую камісію, — звярнуў увагу **намеснік начальніка Гомельскага гарадскога аддзела Следчага камітэта АСК Яўген ПІКУЛІН.** — Калі ваенкамат на бягучы момант прызнаў юнака прыгодным да ваеннай службы, то і для навучання на нашым факультэце, хутчэй за ўсё, перашкод не будзе.

Супрацоўнікі Следчага камітэта папярэдзілі выпускнікоў гімназіі, што ўступная кампанія для будучых следчых і міліцыянераў пачынаецца раней, чым для грамадзянскіх спецыялістаў. Патрабуецца дадатковы час для правядзення адбору. Прынамсі, кандыдатаў на паступленне будуць праверваць на законапаслухмянасць. Прасцей кажучы, глядзець, ці здзяйсняліся яны ў мінулым адміністрацыйныя і тым больш крымінальныя ўчынкі.

Скарыстаўшыся магчымасцю, следчыя расказалі гімназістам пра санкцыі, прадугледжаныя за загадзя жывае паведамленне аб небяспецы, наўмысне пашкоджанне маёмасці, у тым ліку фасадаў будынкаў і салонаў грамадскага транспарту, абразу прадстаўнікоў улады, службовых асоб пры выкананні імі абавязкаў.

— Мы прыйшлі ў гімназію, каб даць найбольш поўнае ўяўленне аб сваёй службе, у якой рамантыка спалучаецца з вельмі цяжкай работай, часцяком у школу асабістаму жыццю. Мэта — сагітаваць на атрыманне вышэйшай юрыдычнай адукацыі сапраўды матываваных маладых людзей. На бягучы момант паспрабаваць свае сілы вырашылі 13 чалавек, — расказаў Яўген Пікулін.

У чым заключаецца работа следчага? Якое тэхнічнае абсталяванне выкарыстоўваецца пры расследаванні злачынстваў? Пра прафесію знутры вучні з розных школ Гомеля змаглі даведацца падчас наведвання ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці. Хлопцы і дзяўчаты пайдзельнічалі ў следчых дзеяннях, наведалі крымналістычны палігон, пагутарылі з нядаўнімі выпускнікамі Акадэміі МУС і з дасведчанымі супрацоўнікамі.

Сваім вопытам падзяліўся **начальнік Гомельскага гарадскога аддзела Следчага камітэта палкоўнік юстыцыі Аляксандр ЕЎТУХОЎ.** Ён адзначыў, што работу следчага спасцігае дагэтуль, бо, як вядома, — век жыві, век вучыся:

— Мой шлях у прафесію быў доўгі, але аб зробленым выбары не шкадую, — прызнаўся Аляксандр Міхайлавіч. — Гэтая праца прыносіць карысць нашым людзям, нашаму гораду.

Штогод ва ўсіх тэрытарыяльных падраздзяленнях упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці праводзіцца работа па адборы кандыдатаў на паступленне на следча-экспертны факультэт Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь. У межах уступнай кампаніі бягучага года свае дзверы адкрыў і абласны апарат.

— Сёння ўкамплектаванасць упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці знаходзіцца на досыць высокім узроўні. Мы ўважліва падыходзім да адбору кандыдатаў на службу, пачынаем са школы, паколькі менавіта там большасць робіць свой выбар адносна будучай прафесіі, — адзначыў **начальнік управлення кадраў і ідэалагічнай работы ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці Уладзімір БАБКОЎ.** Ён звярнуў увагу, наколькі важна не толькі данесці да школьнікаў інфармацыю аб следчай рабоце, але і падкрэсліць высокі гонар і адказнасць, уласцівыя для звання афіцэра.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

ПРА ШТО ВАРТА (НЕ ВАРТА) ПІСАЦЬ

У год у Мінжылькамгас паступае каля 3,5 тыс. звароташ, расказаў спецыяліст. Пытанні разнапланавыя і датычацца ўсіх аспектаў дзейнасці ЖКГ: паляпшэння жыллёвых умоў, выдзялення арэнднага сацыяльнага жылля і, зразумела, абслугоўвання жыллёвага фонду і аказання жыллёва-камунальных паслуг — выключыць адну пераважную тэматыку немагчыма.

— У тым, што грамадзяне так актыўна пішуць у Мінжылькамгас, няма нічога дзіўнага, паколькі наша сфера адказнасці — гэта, па сутнасці, камфортныя ўмовы пражывання і жыццядзейнасці чалавека, — адзначае суразмоўнік. — Бо раніца ў кожнага чалавека пачынаецца не з кубачка кавы (як паказваюць у рэкламе), а з наведвання санвузла, з адкручвання крана з гарачай вадой, з таго, добра (ці дрэнна) працуе сістэма ацаплення. І ўсё гэта — праца камунальнікаў. Таму тыя пытанні, якія паступаюць да нас штодня, як правіла, патрабуюць неадкладных рашэнняў і знаходзяцца ў кампетэнцыі мясцовых органаў, гэта значыць, павінна вырашацца на месцах. І яны вырашаюцца. Таму пазіцыя: чым вышэй звярнуцца, тым хутчэй вырашыцца пытанне, не зусім правільная. У кожнага дзяржаўнага органа ёсць свая кампетэнцыя, і калі мясцовыя органы ўлады абавязваныя арганізаваць, дапусцім, прыборку снегу на тэрыторыі раёна, то і зварот у першую чаргу неабходна адрасаваць туды. А што датычыцца звароташ, якія ідуць ужо ў рамках абскарджвання якіх-небудзь рашэнняў на месцах, такія звароты разглядаюцца на ўзроўні міністэрства. І калі выяўляюцца фактыненалежнага разгляду скаргаў людзей выканкамам або прадпрыемствам ЖКГ, прымаюцца меры.

«Хочам дамагчыся таго, каб любая заяўка вырашалася хутка і без якіх-небудзь нязручнасцяў для спажыўца».

ТЭМАТЫКА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СЕЗОНА

Паводле слоў спецыяліста, тэмы звароташ у Мінжылькамгас залежаць ад сезона. Таксама тэматыка «прывязваная» да змянення ў жыллёвым заканадаўстве і ў парадку аказання жыллёва-камунальных паслуг.

— Дзесьці людзі не змаглі разабрацца, як дзейнічае той ці іншы нарматыўны дакумент, і, адпаведна, нам паступаюць звароты з просьбай растлумачыць, як дзейнічаць у той ці іншай сітуацыі, — кажа спецыяліст. — А што датычыцца сезоннасці, тут тэматыка звароташ залежыць як ад надвор'я, так і ад пары года.

У пераходны асенне-зімовы перыяд пераважаюць пытанні па тэрмінах уключэння ацяплення і неналежнай тэмпературы ў жылых памяшканнях, расказаў суразмоўца. У вясна-летні перыяд таксама шмат пытанняў па ацепленні, але ўжо «ў адваротны бок»: «Горача, калі адключыце батарэі?» Узімку найбольш частыя пытанні датычацца прыборкі снегу. З пачаткам вясны пачынаюцца звароты па капрамонце жыллёвага фонду. Таксама шмат пытанняў камунальнікам падкідвае падрыхтоўка да наступнага ацяплянага сезона, а дакладней, адключэнне гарачай вады.

— Хоць не сказаў бы, што пытанняў па адключэнні вады мінулым летам было шмат. Магчыма, дае вынік тая інфармацыйная работа, якую мы праводзім. Людзі пачынаюць разумець, што сезоннае адключэнне вады неабходна, хоць і дастаўляе нязручнасці. Без гэтага, улічваючы магчымасці цеплатрас і тэхналагічную аснашчанасць эксплуатуючых арганізацый, не абысціся. Тым больш мы скарацілі, наколькі гэта магчыма, тэрміны летняга адключэння гарачай вады.

Адзіны кантакт-цэнтр ЖКГ з'явіўся ў Мінску ў 2015 годзе, а ў 2019-м служба 115 была ўкаранёная па ўсёй краіне.

Цяпер, у міжсезонне, вылучыць нейкае адзінае пытанне, з якім звяртаюцца найчасцей, немагчыма. Ёсць пытанні ацяплення, добраўпарадкавання тэрыторый (снежная зіма нагадвае пра сябе: у прыватнасці, пашкоджаны дарожнае палатно, пакрыццё ў дварах).

— Шмат званкоў на адну тэму паступае, толькі калі адбываецца нейкая аварыйная сітуацыя. Тады людзі спрабуюць звяртацца ва ўсе інстанцыі, уключаючы міністэрства. Але апошнім часам такіх сітуацый не было.

Вясна пакуль у нас толькі ў календары, а не за акном, але ўжо пачынаюць паступаць звароты з нагоды капрамонту дамоў, адзначае спецыяліст.

— Галіна ставіць перад сабой сур'ёзныя задачы, — кажа Генадзь Аксюліовіч. — За сезон павінен быць выкананы капрамонт не менш чым 3 % усяго жыллёвага фонду на краіне. Каб здолець гэта зрабіць, неабходна прыступаць да яго, як толькі пачынаюць дазваляць умовы надвор'я.

ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ СКАРДЗЯЦЦА МІНЧАНЕ

Можна вылучыць рэгіён, адкуль паступае больш за ўсё скаргаў? Адназначна, гэта Мінск, кажа суразмоўнік. Але справа не ў «сварлівасці» і распешчанасці сталічных жыхароў, а ў шчыльнасці насельніцтва.

— У сталіцы найбольшая колькасць спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг у параўнанні з абласнымі цэнтрамі, і, зразумела, у разы больш, чым у сельскай мясцовасці. Тут запатрабаваны ўвесь комплекс паслуг, якія аказвае жыллёва-камунальная гаспадарка: і вада, і цяпло, і электрагазазабеспячэнне, і капрамонт. У сельскіх населеных пунктах дамы звычайна ў прыватнай уласнасці, а значыць, жыллёва-камунальнае абслугоўванне ажыццяўляецца толькі часткова — як правіла, гэта вывад бытавых адходаў, у частцы населеных пунктаў яшчэ і цэнтральнае водазабеспячэнне. А значыць, і менш пытанняў. Акрамя таго, у сельскай мясцовасці пытанні ЖКГ (з улікам аб'ёмаў) у большай ступені вырашаюцца на месцах.

Неадэкватныя заявы — не па адрасе або з падачы «прафесійных скаржнікаў» — супрацоўнікі аддзела звароташ гарамадзян у памяці не трымаюць.

— Бываюць слёзныя просьбы аб дапамозе, якія прымушаюць прымаць дадатковыя меры па межамі кампетэнцыі ЖМКГ: звязваюцца з адпаведнымі арганізацыямі, якія могуць вырашыць пытанне, адсочваць сітуацыю са звароташ, — кажа спецыяліст. — Бываюць іранічныя звароты, дзе няма канкрэтнага пытання: іх пішуць з мэтай «павыхваўць» камунальнікаў. Часам звароты змяшчае прапановы па ўдасканаленні сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Іх мы стараемся ўлічваць, правоздаць карэкціроўку нарматыўна-прававых актаў.

Суразмоўнік расказаў, што адказ пры звароце ў Мінжылькамгас атрымлівае кожны. Тэрміны, у якія іх даюць, прадугледжаны законам і складаюць ад 15 да 30 дзён. У выпадку калі пытанне не ў кампетэнцыі, яго пераадрасуюць адпаведнаму ведамству на працягу пяці рабочых дзён. У гэты ж тэрмін чалавек атрымлівае паведамленне, што зварот не падлягае разгляду або з заяўнікам спыняецца перапіска.

ЗВАРОТАЎ СТАЛА МЕНШ

Каранавірус унёс карэктывы і ў жыллёва-камунальную сферу. Напрыклад, калі ў ранейшыя гады людзі звярталіся з патрабаваннем правесці капрамонт іх дома, настойвалі на паўторным абследаванні будынка: маўляў, не ўбачылі, не дагледзелі, то ў 2020-м у Міністэрстве ЖКГ сталі актыўна паступаць просьбы адмяніць капрамонт.

— Пры капітальным рамонце дома работы праводзяцца як у месцах агульнага карыстання, так і непасрэдна ў жылых памяшканнях. Жыхары баяцца, што будаўнікі могуць «прынесці» ім вірус, — растлумачыў суразмоўнік.

А ў цэлым у перыяд, калі многія знаходзіліся дома на самаізаляцыі, звароташ да камунальнікаў больш не стала. Надавярот:

— Апошнім часам колькасць звароташ знізілася амаль на 10 %, як у міністэрства, так і ў сістэме ЖКГ у цэлым.

Але камунальнікі звязваюць гэты факт не з пандэміяй, а з работай дыспетчарскай службы 115. Адзіны кантакт-цэнтр ЖКГ з'явіўся ў Мінску ў 2015 годзе, а ў 2019-м служба 115 была ўкаранёная па ўсёй краіне.

— Мы паступова ўдасканальваем яе работу, — расказае суразмоўнік. — Хочам дамагчыся таго, каб любая заяўка вырашалася хутка і без якіх-небудзь нязручнасцяў для спажыўца. На сённяшні дзень ёсць пытанні: дзе-нідзе на месцах камунальныя службы не дапрацоўваюць, забываюць, ігнаруюць, ставяцца фармальна: напрыклад, разглядаюць заяўку без выезду на месца.

Фармат работы службы 115 не дазваляе камунальнікам абмежавацца адпіскай, расказалі ў міністэрстве. Зручнасць такой сістэмы ў тым, што любы званок, які паступае на гэты нумар, можна ўбачыць на любым узроўні — як на ўзроўні Міністэрства ЖКГ, так і на ўзроўні выканкама — прааналізаваць рашэнне праблемы заяўніка.

— Раней прадпрыемства, якое аказвае жыллёва-камунальныя паслугі (напрыклад, паслугі водазабеспячэння), таксама прымала заяўкі і ліквідавала непаладкі. Натуральна, што будаўнікі могуць «прынесці» ім вірус, — растлумачыў суразмоўнік.

А ў цэлым у перыяд, калі многія знаходзіліся дома на самаізаляцыі, звароташ да камунальнікаў больш не стала. Наадварот:

— Апошнім часам колькасць звароташ знізілася амаль на 10 %, як у міністэрства, так і ў сістэме ЖКГ у цэлым.

Але камунальнікі звязваюць гэты факт не з пандэміяй, а з работай дыспетчарскай службы 115. Адзіны кантакт-цэнтр ЖКГ з'явіўся ў Мінску ў 2015 годзе, а ў 2019-м служба 115 была ўкаранёная па ўсёй краіне.

— Мы паступова ўдасканальваем яе работу, — расказае суразмоўнік. — Хочам дамагчыся таго, каб любая заяўка вырашалася хутка і без якіх-небудзь нязручнасцяў для спажыўца. На сённяшні дзень ёсць пытанні: дзе-нідзе на месцах камунальныя службы не дапрацоўваюць, забываюць, ігнаруюць, ставяцца фармальна: напрыклад, разглядаюць заяўку без выезду на месца.

Фармат работы службы 115 не дазваляе камунальнікам абмежавацца адпіскай, расказалі ў міністэрстве. Зручнасць такой сістэмы ў тым, што любы званок, які паступае на гэты нумар, можна ўбачыць на любым узроўні — як на ўзроўні Міністэрства ЖКГ, так і на ўзроўні выканкама — прааналізаваць рашэнне праблемы заяўніка.

— Раней прадпрыемства, якое аказвае жыллёва-камунальныя паслугі (напрыклад, паслугі водазабеспячэння), таксама прымала заяўкі і ліквідавала непаладкі. Натуральна, што будаўнікі могуць «прынесці» ім вірус, — растлумачыў суразмоўнік.

ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ СКАРДЗЯЦЦА МІНЧАНЕ

Можна вылучыць рэгіён, адкуль паступае больш за ўсё скаргаў? Адназначна, гэта Мінск, кажа суразмоўнік. Але справа не ў «сварлівасці» і распешчанасці сталічных жыхароў, а ў шчыльнасці насельніцтва.

— У сталіцы найбольшая колькасць спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг у параўнанні з абласнымі цэнтрамі, і, зразумела, у разы больш, чым у сельскай мясцовасці. Тут запатрабаваны ўвесь комплекс паслуг, якія аказвае жыллёва-камунальная гаспадарка: і вада, і цяпло, і электрагазазабеспячэнне, і капрамонт. У сельскіх населеных пунктах дамы звычайна ў прыватнай уласнасці, а значыць, жыллёва-камунальнае абслугоўванне ажыццяўляецца толькі часткова — як правіла, гэта вывад бытавых адходаў, у частцы населеных пунктаў яшчэ і цэнтральнае водазабеспячэнне. А значыць, і менш пытанняў. Акрамя таго, у сельскай мясцовасці пытанні ЖКГ (з улікам аб'ёмаў) у большай ступені вырашаюцца на месцах.

Неадэкватныя заявы — не па адрасе або з падачы «прафесійных скаржнікаў» — супрацоўнікі аддзела звароташ гарамадзян у памяці не трымаюць.

— Бываюць слёзныя просьбы аб дапамозе, якія прымушаюць прымаць дадатковыя меры па межамі кампетэнцыі ЖМКГ: звязваюцца з адпаведнымі арганізацыямі, якія могуць вырашыць пытанне, адсочваць сітуацыю са звароташ, — кажа спецыяліст. — Бываюць іранічныя звароты, дзе няма канкрэтнага пытання: іх пішуць з мэтай «павыхваўць» камунальнікаў. Часам звароты змяшчае прапановы па ўдасканаленні сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Іх мы стараемся ўлічваць, правоздаць карэкціроўку нарматыўна-прававых актаў.

Суразмоўнік расказаў, што адказ пры звароце ў Мінжылькамгас атрымлівае кожны. Тэрміны, у якія іх даюць, прадугледжаны законам і складаюць ад 15 да 30 дзён. У выпадку калі пытанне не ў кампетэнцыі, яго пераадрасуюць адпаведнаму ведамству на працягу пяці рабочых дзён. У гэты ж тэрмін чалавек атрымлівае паведамленне, што зварот не падлягае разгляду або з заяўнікам спыняецца перапіска.

ЗВАРОТАЎ СТАЛА МЕНШ

Каранавірус унёс карэктывы і ў жыллёва-камунальную сферу. Напрыклад, калі ў ранейшыя гады людзі звярталіся з патрабаваннем правесці капрамонт іх дома, настойвалі на паўторным абследаванні будынка: маўляў, не ўбачылі, не дагледзелі, то ў 2020-м у Міністэрстве ЖКГ сталі актыўна паступаць просьбы адмяніць капрамонт.

— Пры капітальным рамонце дома работы праводзяцца як у месцах агульнага карыстання, так і непасрэдна ў жылых памяшканнях. Жыхары баяцца, што будаўнікі могуць «прынесці» ім вірус, — растлумачыў суразмоўнік.

А ў цэлым у перыяд, калі многія знаходзіліся дома на самаізаляцыі, звароташ да камунальнікаў больш не стала. Надавярот:

— Апошнім часам колькасць звароташ знізілася амаль на 10 %, як у міністэрства, так і ў сістэме ЖКГ у цэлым.

Але камунальнікі звязваюць гэты факт не з пандэміяй, а з работай дыспетчарскай службы 115. Адзіны кантакт-цэнтр ЖКГ з'явіўся ў Мінску ў 2015 годзе, а ў 2019-м служба 115 была ўкаранёная па ўсёй краіне.

— Мы паступова ўдасканальваем яе работу, — расказае суразмоўнік. — Хочам дамагчыся таго, каб любая заяўка вырашалася хутка і без якіх-небудзь нязручнасцяў для спажыўца. На сённяшні дзень ёсць пытанні: дзе-нідзе на месцах камунальныя службы не дапрацоўваюць, забываюць, ігнаруюць, ставяцца фармальна: напрыклад, разглядаюць заяўку без выезду на месца.

Фармат работы службы 115 не дазваляе камунальнікам абмежавацца адпіскай, расказалі ў міністэрстве. Зручнасць такой сістэмы ў тым, што любы званок, які паступае на гэты нумар, можна ўбачыць на любым узроўні — як на ўзроўні Міністэрства ЖКГ, так і на ўзроўні выканкама — прааналізаваць рашэнне праблемы заяўніка.

— Раней прадпрыемства, якое аказвае жыллёва-камунальныя паслугі (напрыклад, паслугі водазабеспячэння), таксама прымала заяўкі і ліквідавала непаладкі. Натуральна,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

у інтэрэсах прадпрыемства было як мага больш гэтых прэтэнзій адпрацаваць у доўгую скрыню, «забыцца», падысці да пытання фармальна. Сёння мы выбудавалі механізм, калі прадпрыемства, якое аказвае ЖКГ-паслугі, не звязана з прыёмам прэтэнзій. Вы падаеце прэтэнзію ў незалежную службу, якой без розніцы, чым вы незадаволеныя, па якім пытанні скардзіцеся і колькі разоў вы тэлефануеце. Яны проста фіксуюць ваш зварот і накіроўваюць выканаўцу, а таксама кантралююць выкананне заявак.

МАБІЛЬНАЯ ПРАГРАМА «115»

Генадзь Аксціловіч адзначае, што ў год толькі па Мінску ў службу 115 паступае каля мільёна заявак.

— Таму мы ўводзім розныя фарматы зваротнай сувязі са спажыўцом жыллёва-камунальных паслуг, — расказае ён. — Напрыклад, нядаўна з'явіўся фармат зваротнай сувязі, калі пасля завяршэння рамонтных работ спажыўцу даецца магчымасць пакінуць свой водгук.

Заяўніку ператэлефануе аператар або робат і ўдакладняе, наколькі якасна выкананы работы (і ці выкананы наогул).

— Не магу сказаць, што водгукаў людзі пакідаюць шмат, але пытанні ад ліквідацыі праблемы, з якой яны звярнуліся.

Партал 115.бел таксама атрымаў распаўсюджванне. Тут ёсць магчымасць зазняць праблему ў вашым населеным пункце або няспрэчнасць у вашым доме для камунальнікаў, якія будуць вырашаць пытанне. Спецыяліст кажа, што гэта зручны фармат работы для абодвух бакоў. Яшчэ адно ноу-хаў ЖКГ — мабільная праграма «115». Дастаткова проста спампаваць яе і прывязаць свой акаўнт да тых адрасоў, дзе вы жывяце (адрасоў можа быць да шасці). Цяпер вы будзеце атрымліваць апавяшчэнні — напрыклад, ад планавым або незапланаваным адключэнні вады, пра тое, што ў вашым доме на працягу гадзіны-дзвюх не будзе электрычнасці і г. д. А таксама можаце падаць заяўку і ў анлайн-рэжыме адсочваць яе лёс.

— Мабільная праграма існуе ўжо каля года, мы яе яшчэ дапрацоўваем, так што карыстальнікаў пакуль не так шмат. Але, думаю, з кожным годам іх колькасць будзе расці, — упэўнены суразмоўнік.

Дзіяна РОНІНА.

Скажыце, доктар...

НУ І ЯЗВА!

Як яе «набываюць», і чаму захворванне варта своечасова лячыць

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Сёння, напэўна, няма чалавека, які не сутыкаўся б з праблемамі страўнавання. Але ці ўсе болі ў вобласці страўніка звязаны з яго хваробай? Чым небяспечная язва і ці лёгка ад яе пазбавіцца? Як заражаюцца бактэрыямі хелікабактар, які выклікаюць язву, і ці можа гэта адбывацца праз посуд і пацалункі? Навошта перад апэрацыяй на галаўным мозгу рабіць фібрагастраскапію ці кансультавацца ў гастраэнтролага? Аб праблемах, з якімі можа сутыкнуцца кожны, расказаў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумэн ГУРБАНІДЖАД.



— Доўгі час медыкі і вучоныя не маглі да канца разабрацца, у чым прычыны язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Лічылі не само захворванне, а змагаліся з сімптомамі. Людзі пазбаўляліся часткі страўніка ці блукаючага нерва — лічылася, што гэта дазволіць пазбегнуць рэцыдыву. Але і гэта цалкам праблему не вырашала. Толькі ў 1984 годзе ўрач і вучоны Барыс Маршал на сабе даказаў, што язва страўніка мае бактэрыяльнае паходжанне і асноўная яе прычына — хелікабактар пілары, бактэрыя, якая інфікуе розныя часткі страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Урач сам выпіў культуру бактэрыі, заквараўся і дастаткова цяжкай форме і вылечыўся. Гэта стала выдатным адкрыццём, і з таго часу язву сталі лячыць па-іншаму.

— Як зразумець, што адбылося заражэнне?

— Рэч у тым, што мы гэтага не адчуваем. Гэта не грып, калі вірус, трапіўшы ў арганізм, выклікае павышаную тэмпературу і насмарк. Пра хелікабактар мы даведаемся, калі атрымліваем наступствы. Як вядома, саляная кіслата — гэта агрэсіўнае асяроддзе, і наш страўнік прыстасаваўся ўсю ежу, якая ў яго трапіла. Пры гэтым сам страўнік складаецца з мышцаў, сасудаў, і мае пэўную ахову, каб не ператраўліць самога сябе. Гэтай аховай з'яўляецца слізь. Дык вось хелікабактэрыі разбураюць гэты ахоўны слой: сама слізістая аказваецца ў небяспецы. Так мы атрымліваем язву страўніка. Мы гэта адчуваем як боль, але тут важна высветліць, звязаны ён менавіта з язвай страўніка ці не.

— З чым яшчэ можа быць звязаны боль у страўніку?

— Усе мы маем так званы блукаючы нерв. У яго доўгі шлях: ідзе з галаўнога мозга, праз сэрца, страўнік і далей. Ёсць такое паняцце, як функцыянальная дыспепсія. Мы адчуваем моцны боль у вобласці эпігастрыя, але нам ён нічым сур'ёзным не пагражае. Калі чалавек знаходзіцца ў стане моцнага стрэсу ці дэпрэсіі, нармальны сігнал, які ідзе з боку страўніка, галаўны мозг успрымае як болевы сіндром. І калі чалавек супакоіцца ці пачне прымаць антыдэпрэсанты, боль пройдзе. Пры гэтым страўнік выконвае і працягвае выконваць сваю работу паўнацэнна. Нярэдка нават самому доктару няпроста адрозніць функцыянальную дыспепсію ад іншых хвароб страўніка. Для гэтага патрабуецца прафесійная дыягностыка, кропку звычайна дапамагае паставіць фібрагастраскапія.

А ёсць стрэсавая язва, якая можа амаль не балець, але адносіцца да цяжкіх захворванняў страўніка-кішачнага тракту. Калі яе своечасова не лячыць, усё можа скончыцца дрэнна. Стрэсавая язва бывае ў людзей, якія таксама доўга адчуваюць стрэс, часта такія пацыенты знаходзяцца ў рэанімацыі пасля складаных аперацыі, напрыклад, на галаўным мозгу. У іх можа парушацца сакрэцыя слізі ў страўніку, адпаведна разбураецца яго ахоўны слой. Стрэсавая язва, у адрозненне ад звычайнай, можа не суправаджацца моцным болем ці спазмамі, часам хворы ні на што не скардзіцца. Знаходзяць яе, калі пачынаецца страўнікавае кровацячэнне — мелена (чорны панос) ці рвота «кафейнай гушчай», падае ўзровень эрытрацытаў.

Ёсць шэраг іншых захворванняў, якія выклікаюць болі ў эпігастральнай вобласці, але яны не звязаны з язвай страўніка. Вопытны гастраэнтролаг можа дыферынцаваць гэтыя захворванні, у прыватнасці, хваробу Крона і іншыя. Пакольку блукаючы нерв звязвае сэрца і страўнік, здараецца, што пацыент скардзіцца на боль у вобласці страўніка, а праблема знаходзіцца ў сэрцы. Часам так праяўляе сябе інфаркт міякарда. Таму з вострым болем страўніка заўсёды робяцца стандартныя абследаванні, у тым ліку здымаюць кардыяграму. Самастойна цяжка зразумець, што з табой адбываецца. На дачы баліць страўнік, чалавек пачынае прымаць нашпу, іншыя абязбольвальныя ці страўнікавыя прэпараты, а ў яго развіваецца інфаркт. Тут заўсёды небяспечна звяртацца да доктара.

— Як заражаюцца бактэрыяй хелікабактар?

— Яна трапляе ў наш арганізм праз рот. І адбываецца гэта часта ў дзіцячым узросце. Таму першая прафілактыка — захаванне гігіены: мыць рукі, не грызці пазногці ці кончык ручкі.

— Ці можа хелікабактар захоўвацца на посудзе і ці ёсць імавернасць заразіцца, скажам, у кафэ? Калі ў сям'і ёсць хворы, ён мусіць есці з асобнага посуду?

— Заражэнне адбываецца фекальна-аральна. Сапраўды, часта пытаюць, ці жывое хелікабактар у поласці рота, ці можна праз пацалункі заразіцца. Хелікабактар можа знаходзіцца ў роце ў двух выпадках. Першы — калі бактэрыя трапіла туды нядаўна. Яна жыве ў кіслым асяроддзі, і чым яно больш кіслае ў страўніку, тым лепш яна сябе адчувае. У роце не кіслае асяроддзе, таму доўга яна там не знаходзіцца. Другі выпадак — калі адбываецца рэфлюкс. Пры запушчанай язве страўніка характэрныя адрыжка і закід смесцівы страўніка ў страваход.

Рэфлюкс небяспечны яшчэ вось чым. Калі ў страўніку кіслае асяроддзе, то ўжо ў дванаццаціперснай кішцы — шчолачнае. Але кожны ўчастак нашай страваальнай сістэмы прызвычаіўся працаваць у сваім асяроддзі, і іншае яму не падыходзіць. Каб яны не змешваліся, у нас маюцца клапаны, якія знаходзяцца паміж страўнікам і дванаццаціперснай кішкой, страўнікам і страваводам, і яны перашкаджаюць зваротнаму выкіду. Таму рэфлюкс варта лячыць. Ён пагражае не толькі горычу ў роце і дыспепсічным расстройствам. Калі гэта доўга працягваецца, могуць утварацца атыповыя клеткі і развіваецца рак. Калі надоўга прымаеце гарызантальнае становішча, у прыватнасці, перад сном, пажадана, каб страўнік быў пусты.

—Ці ёсць генетычная схільнасць да заражэння хелікабактарам?

— Імунітэту ад хелікабактара, на вялікі жаль, няма. І калі вынайдуць вакцыну, то мы зробім вялікі крок у лячэнні, а колькасць хворых будзе вельмі малая.

— Як даведацца, што адбылося заражэнне, калі адсутнічаюць сімптомы?

— Гастраэнтролагі прапануюць розныя метадыкі, пачынаючы ад тэста на дыханне, заканчваючы антыцеламі ў крыві і фібрагастраскапіяй. Калі звярнуцца да гастраэнтролага, ён вызначыць найбольш падыходзячую для вас метадыку.

— Гастрыт — гэта пачатак язвы? Ці трэба яго лячыць?

— Гэта запаленне слізістай страўніка, якое марудна развіваецца. Яно здараецца з-за названых мной прычын, у тым ліку хелікабактара і рэфлюксу. І калі гэты стан не лячыць, у далейшым ён вядзе да атрафіі слізістай страўніка. І потым мы выяўляем у гэтых месцах рак. Паводле некаторых аўтараў, 80—85 % выпадкаў раку страўніка выкліканы хелікабактарам. Усё пачынаецца з простага гастрыту, які не лечаць.

— У чым заключаецца лячэнне?

— Сённяшнія прататыпы лячэння прадугледжваюць прызначэнне інгібітараў пратонавай помпы — прэпаратаў, якія змяншаюць узровень кіслотнасці ў нашым страўніку для зніжэння агрэсіўнасці асяроддзя, што садзейнічае зажыўленню слізістай. Адначасова прызначаюцца антыбіётыкі і гастрапратэктары — яны ахоўваюць сценкі страўніка.

tatyun.ru

Многія здзіўляюцца, што мы камбінуем адначасова некалькі антыбіётыкаў. Праблема заключаецца ў тым, што сучасная ежа ўтрымлівае невялікую колькасць антыбіётыкаў. Яны трапляюць у наш страўнік праз мяса, калі жывёла хварэла, і яе лячылі. Часам антыбіётык дадаюць у якасці кансерванту. У выніку хелікабактар выпрацоўвае рэзістэнтнасць (устойлівасць), і прыходзіцца прызначаць некалькі прэпаратаў, каб яе знішчыць. Прыкладна кожныя 10 гадоў з'яўляецца новае пакаленне антыбіётыкаў, а рэзістэнтнасць бактэрыі выпрацоўваюць нашмат хутчэй, чым удаецца стварыць новы антыбактэрыяльны прэпарат.

— Ці трэба падчас лячэння абмяжоўваць сябе ў нейкіх прадуктах?

— Сучаснае лячэнне язвы страўніка не патрабуе вялікіх абмежаванняў. Пацыенты атрымліваюць гастрапратэктары і інгібітары пратонавай помпы, а сама ежа на лячэнне язвы страўніка не ўплывае. Канешне, не трэба есці ўсё запар, ніхто не адмяняў правілаў здаровага харчавання. Тут трэба памятаць, што наш страўнік любіць, калі мы прымаем ежу маленькімі порцыямі, але часта. Так выпрацоўваецца больш слізі і наш страўнік больш абаронены. Тут важна, не столькі *што* вы будзеце есці, а *як часта і колькі*.

— Колькі часу звычайна займае лячэнне?

— Для аблягчэння вострай фазы — у сярэдніх два-тры тыдні з курсам антыбіётыкаў. Каб страўнік аднавіць, прыём інгібітараў пратонавай помпы працягваецца яшчэ пэўны час. Калі пасля лячэння адбываецца паўторнае заражэнне праз нейкі час, патрабуецца паўторнае лячэнне. Але гэта не сведчыць пра тое, што прызначэнне было неэфектыўнае.

— Наколькі высокая верагоднасць знішчыць хелікабактар і вылечыць язву страўніка?

— Нашы гастраэнтролагі паспяхова лечаць язву страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Калі своечасова звярнуцца да доктара, усё скончыцца добрым вынікам.

— А калі язва доўга не зажывае?

— Такое здараецца. Часам так маскіруецца рак. Таму калі язва доўга не зажывае, трэба праверыцца на рак страўніка. У нас, дарэчы, ён займае па распаўсюджанасці пятае месца сярод іншых анкалагічных хвароб.

— У які момант варта звярнуцца да ўрача, улічваючы, што праяў інфіцыравання хелікабактарам спачатку няма? Колькі часу праходзіць да з'яўлення сімптомаў?

— Гэта вельмі індывідуальна. Як і з любым захворваннем, лепш правадзіць прафілактыку, а не чакаць прыступаў болю. Вызначыць наяўнасць хелікабактара пры сучасных лабараторных магчымасцях вельмі проста. Спачатку варта звярнуцца да гастраэнтролага, каб ён ацаніў стан вашага страўніка і вызначыў, ці патрабуецца абследаванне і лячэнне. Не трэба баяцца і саромецца, не заўсёды ёсць патрэба ў глытанні «зонда». Як я казаў, наяўнасць хелікабактара можна вызначыць праз дыханне ці па аналізе крыві. Дый у сучаснай фібрагастраскапіі можа выбіцца пад седацыяй — гэта не наркоз, а сон. Калі вы адносіцеся да групы рызыкі, а гэта ўзрост 60+, жаночы пол і наяўнасць у сям'і раку страўніка, трэба правярацца.

— Чаму перад плануемай апэрацыяй трэба рабіць ФГДС ці кансультавацца ў гастраэнтролага?

— Я казаў пра стрэсавую язву, якую можна атрымаць падчас працяглага і складанага лячэння. Часам урачу даводзіцца прызначаць нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты. Гэта група лекаў, якая змяншае выпрацоўку слізі слізістай страўніка. І калі мы ўжо маем праблему са страўнікам — вострую язву ці абвастрэнне гастрыту — дадалі стрэс і нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты, то можа ўзнікнуць страўнікавае кровацячэнне ці нават перфарацыя страўніка, калі змесціва трапляе ў брушную поласць.

— Ці ўплываюць шкодныя звычкі на абвастрэнне язвы страўніка?

— Алкаголь моцна не ўплывае на гэта захворванне, ён больш шкодзіць печані і падстраўнікавай залозе. А вось курэнне мае не прамое ўздзеянне, а ўскоснае. Цыгарэта звужае сасуды ва ўсім целе, і страўнік — не выключэнне. І калі звужаюцца сасуды слізістай, змяншаецца выпрацоўка слізі. Акрамя таго, за кошт згарання тытуню выпрацоўваюцца канцэрагены, мы іх глытаем і, такім чынам, паскараем шлях да раку страўніка. Курэнне пры язве — гэта двайны ўдар па здароўі.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Наш чалавек

У СВАЁЙ ВЁСЦЫ, НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

«Дзівак», — кажа хто-нікто пра Аляксандра Ермаловіча, і здаецца, што мае рацыю. Ну сапраўды: у Аляксандра ёсць кватэра ў Мінску (падарунак бацькі), ёсць двухпакаёўка ў Беразіне, а жыве ён апошнім часам у звычайнай сялянскай хаце, у вёсцы Вязькуцін, дзе ні крамы табе, ні школы, ні клуба... А да ўсяго трымае на сваім падворку столькі жыўнасці...

Пасля школы Аляксандр Ермаловіч не марыў ні начальніцкія партфелі, ні белыя каўнерыкі. Спачатку падаўся ў будаўнікі — папрацаваў... Не спадабалася. Пайшоў на курсы трактарыстаў і потым, атрымаўшы «дыплом», вярнуўся да сябе на радзіму, стаў незаменным спецыялістам у мясцовай гаспадарцы. Ва ўсякім разе, ва ўмовах сёлетняй зімы з яе заваямі дні сумётамі без Аляксандра ды яго «Амкадора» тут дакладна спынілася б жыццё. А так...

Падʼём у яго ў пяць гадзін раніцы, бо трэба ж даглядзець трох кароў, двух бычкоў, свіней, гусей, курэй, качак...

Уся гэтая гаспадарка — клопат у асноўным самога гаспадара: ён поіць, доіць і корміць... Заканамернае пытанне, чым?

— На час уборкі Саша штогод перасаджваецца на камбайн, — расказвае яго жонка Вольга. — І такім чынам зарабляе не толькі грошы, авяшчэ і зерне. Да таго ж ён сам засявае пустыя прысядзібныя ўчасткі, садзіць бульбу... У нас вырастае ўсё — толькі старайся. Да таго ж Саша — чалавек таварыскі, многіх выручае сам, многія, калі спатрэбіцца, выручаюць яго...

Іншае пытанне, навошта яму вось гэтак «шчыраваць»? Дзяцей жа не сямʼёра на лаўках?

У вёсцы, з бацькамі, і сапраўды, толькі двое школьнікаў. Большы сын ужо працуе, дачка жыве і вучыцца ў Італіі.

Дарэчы, тая сямʼя, якая прымала дзяўчынку на аздараўленне, запрасіла неяк і яе бацьку — узяць адпачынак і па-сапраўднаму адпачыць.

Аляксандр не сказаць каб узрадаваўся, каб гэтага дужа хацеў, але ж на ўгаворы здаўся — махнуў у тую Італію. Казаў, што ў першыя дні ў аховту паляжаў на пляжы, пакатаўся на яхце, а ўжо ў наступныя...

— Лягу спаць і сніцца, што я не па моры плыву, а на камбайне па спелай збажыне. І так ад гэтага радасна, што прачнуся і адразу б, здаецца, дамоў. Не прывык я жыць у абдымках гультайства.

Прывык — у рабоце, у клопатах, у сваёй вёсцы, на сваёй зямлі.

Ніна Бурко,
Бярэзінскі раён.

Трэці ўзрост

«ДЛЯ РАДАСЦІ ТРЭБА НЯШМАТ»

Больш за 60 гадоў таму пры Асіповіцкай цэнтральнай раённай бальніцы быў створаны Савет ветэранаў. Як атрымалася аб'яднаць людзей і чаму ім, пажылым, так важна не адрывацца ад калектыву, весці актыўны спосаб жыцця, расказала яго старшыня Зінаіда Канстанцінаўна ПАЦКЕВІЧ.

— Мы займаемся арганізацыяй вольнага часу нашых пенсіянераў, пішам біяграфіі ветэранаў вайны. За доўгія гады ўдалося апытаць каля 500 чалавек; інфармацыю пра кожнага, што заяваў, сабраць у асобныя адмысловыя папкі, якія ўражваюць усіх, хто цікавіцца работай Савета. Відаць, таму нас некалькі разоў запрашалі на рэспубліканскую канферэнцыю з удзелам прадстаўнікоў Германіі, дзе мы тройчы выйгравалі гранды.

Зрэшты, гэта ўзнагарода не адзіная ў Савета: хор ветэранаў двойчы атрымліваў «Залатыя ліры», а сама Зінаіда Канстанцінаўна — і таксама двойчы — была прызнана жанчынай года Магілёўскай вобласці.

— Было вельмі складана, — прызнаецца яна, — але мы знайшлі зместкі пра ўсіх нашых медыкаў, хто пайшоў на вайну і хто вярнуўся. Пра некага атрымалася менш інфармацыі, пра некага — больш, але ўшанаваны кожны. Гэта вельмі важна было зрабіць хоць бы таму, што з 85 чалавек цяпер застаўся толькі адзін... Увесь матэрыял я аб'ядналі ў кнігу.

Такі вось, можна сказаць, асабісты клопат старшыні пра захаванне памяці цалкам зразумелы, калі вядаць, што свой лёс з бальніцай Зінаіда Канстанцінаўна звязала вельмі даўно, лічыце, у сярэдзіне мінулага стагоддзя.

— Мы раслі без бацькі, — успамінае жанчына. — Ён кінуў сям'ю адразу пасля вайны. А мама была ў партызанскім атрадзе, дзень і ноч працавала, каб пракарміць чацвярых дзяцей... Я скончыла школу першай і вельмі хацела пайсці ў медыцыну, паехаць вучыцца ў Бабруйск. Грошай на гэта ў мамы не было, а ў нас, у Асіповічах, якраз адкрываліся курсы медсёстраў. Я паступіла, стала старастам групы, пайшла працаваць, а з часам — нават выкладаць у вучэбна-выхаваўчым комплексе, рыхтаваць будучых медыцынскіх сёстраў. Многія з іх і сёння працуюць у бальніцы.

Ведае Зінаіда Канстанцінаўна і як падтрымаць тых, хто сышоў на пенсію.

— У нас вельмі папулярныя «Добрыя сустрэчы». Да пандэміі яны праходзілі кожны месяц. Работнікі бібліятэкі прапаноўвалі цікавую тэму, ветэраны бралі кнігі, чыталі, разам абмяркоўвалі, — тлумачыць Зінаіда Канстанцінаўна. — Не так даўно мы сталі арганізоўваць і гутаркі з сацыяльным псіхолагам. На кожную — яна прыносіць розныя тэсты, «прымушае» нас, пажылых, праз многае падумаць, прымерацца на сябе... У цёплае надвор'е мы запрашаем ветэранаў у «Цікі дом»: ладзім сустрэчы на свежым паветры, найчасцей — на ўчастку Марыі Маркаўны Фёдаравай. Таксама выбіраем тэмы для размоў, дзелімся думкамі.

— А вось вячоркі ў нас толькі вясёлыя! — хваліцца Зінаіда Канстанцінаўна. — Гатуем прысмакі, збіраемся, п'ём гарбату... Нават з-за пандэміі істотных збояў у рабоце Савета, здаецца, не было. Мы з Марыяй Маркаўнай рэгулярна тэлефануем нашым ветэранам, віншуем са святамі, пытаемся пра здароўе. Праўда, калі праведваем хворых, у дамы-кватэры ў сувязі з пандэміяй ужо не заходзім: стараемся на вуліцы паразмаўляць з іх роднымі, але ж каб чалавек хоць у акенца бачыў, што да яго прыходзілі, што ён не забыты.

...Асіповічы — горад невялікі (30 тысяч чалавек насельніцтва), аднак Зінаіда Канстанцінаўна ўпэўнена, што магчымасцяў для актыўнага жыцця тут дастаткова. Галоўнае — не замыкацца ў чатырох сценах, сам-насам з тэлевізарам.

— Асобных ветэранаў мы проста выцягваем з дому — разам ходзім на канцэрты, у кіно. У кампаніі ж яно зайсёды цікавей... І людзі потым дзякуюць, што ўзялі іх з сабой, пытаюцца, калі наступны культпаход. Асабліва задаволеныя тыя, хто прыязджае з вёсак. Раніцай, напрыклад, яны да доктара, а потым да нас: тут і гарбаты пап'юць, і канспосы пагартаюць, і фотаздымкі паглядзяць. Іх у нас вельмі шмат: з кожнага мерапрыемства робім «справаздачы», пішам нататкі. Для радасці трэба няшмат.

І сапраўды...

Віталія Крычэўская,
г. Асіповічы.

Весткі з месяцаў

У КОЖНАГА БЫЛІ ТРЫ СПРАВЫ...

І ўсе прыемныя!

З чаго пачынаецца вясна? Вядома ж — з праводзін зімы. У нашым дзіцячым садку Масленіца — ці не самае вясёлае і чаканае свята, бо выхаванцы ведаюць пра бліны, якія трэба есці на тыдні, пра пудзіла, якое трэба спальваць... Аднак ведаць — адно, а вось пабачыць ды яшчэ і прычыніцца...



Некалькі дзён дзеці рыхтаваліся да гэтай падзеі, з нецярпеннем чакалі яе. На заняткаў паслухалі, як раней праводзілі зіму, і добра запомнілі, што на Масленіцу кожны мае тры справы: з горак катацца, бліноў наядацца, з зімой развітацца... Іншымі словамі — весела і разам з дзецьмі праводзіць час: вадзіць карагоды, спяваць, спаборнічаць у смеласці і знаходлівасці, сіле і спрыце, смяяцца з жартаў скамарохаў, і нарэшце — есці духмяныя бліны.

Алеся Медвядзюк,
выхавацель Крытышынскага дзіцячага садка,
Іванаўскі раён.

Год народнага адзінства

КАЛІ ЎСЕ ЯК АДЗІН...

З раніцы 22 чэрвеня 1941 года мая вёскі Калавуравічы, што на Піншчыне, жыла звычайнымі клопатамі: соладка спалі дзеці, завіхаліся каля печаў гаспадыні, спяшаліся на справах гаспадары, на лузе пасвіўся статак кароў... А што недзе выбухі, дык гэта, можа, вучэнні?.. Аднак пад вечар да людзей ужо даляцела страшная вестка: вайна!

Гэтае адно кароткае слова перавярнула ўсё ўсталяванае вякамі жыццё. Праз некалькі дзён у суседняй вёсцы ўжо стаяла нямецкая камендатура, а ў нашых суседзяў пасяліўся нямецкі фельчар. Баязлівы і дурнаваты, ён трымаў на павадку двух сабак, кідаў ім костку, глядзеў, як грызуцца, і рагатаў: «Дас ist Сталін, дас ist Гітлер».

А нападалёк у роўненскіх лясах Украіны (гэта напрастрэк кіламетраў з дзесяць) ужо дзейнічалі народныя месціўцы, ішлі ў партызанскія атрады і мае аднавяскоўцы. Яны пускалі пад адхон варожыя саставы, руйнавалі масты, грамілі гарнізоны — дзейнічалі ў вельмі цяжкіх умовах.

...Цяпер ужо не дазнаешся, чыя — канкрэтна — гэта была ідэя, але нашы мужчыны «пастанавілі», што для партызанаў у кожнай хаце (вёска была працавітая і досыць заможная) па чарзе будзе пячыся хлеб, перапраўляцца палатно ды іншае неабходнае.

Усё сабранае чарговы гаспадар складваў на воз, накрываў посцілкай, а тую — сенам, травой ці дровамі (каб вораг не здагадаўся) і глухімі лясны-мі сцежкамі адвозіў партызанам. Такім чынам усе чатыры гады вяскоўцы дзялілося з імі вежай, вопраткай, абуткам, жанчыны вязалі шкарпэткі і рукавіцы...

Спытаеце, у чым была аднасць? Па словах радні, у тым, што ўся вёска стала як бы адной сям'ёй. І самае галоўнае, што ніхто, ні адзін чалавек, ні разу не здрадзіў, не данёс на сваіх аднавяскоўцаў.

Як не было і таго, каб збілася чарга, каб нехта адмовіўся ад рызыкоўнай дастаўкі. Гэта была сапраўднае аднасць, шчырая адданасць Радзіме!

Ніна Горгуль,
г. Мінск.

Па-чалавечы

Нечаканая дапамога

...Мой тата недзе пасля васьмідзесяці стаў цяжка хварэць. Дзень пры дні ён ляжаў на ложку, а калі рабілася хоць трохі лягчэй, памаленьку ўставаў, сунуўся ў хлеў — выводзіў на траву свайго любімага Орліка.

Вось і ў той раз з цяжкасцю дабрыў да каня, адвязаў яго, хацеў быў надзець аброць і не змог — страціў прытомнасць...

Ачуняў, здаецца, ад холаду, які залазіў яму за каўнер, у вушы, у рукавы... А захацеў падняцца з зямлі — і не здолеў, як ні спрабаваў...

